ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 51 (1022) 17 снежня 2011 г. Кошт 1700 рублёў.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

КІНАСПРОБЫ НА ПЛАКАТ

17 снежня — Дзень беларускага кіно

Акурат да гэтага свята быў прымеркаваны Рэспубліканскі конкурс **«АРТКІНАПЛАКАТ»**. Яго вынікі будуць падведзены 19 снежня, а работы фіналістаў, частку з якіх прадстаўляем на гэтай паласе, можна пабачыць у сталічным Музеі гісторыі беларускага кіно.

КІНАТЭМА — С. 2, 6—8, 14







Дарагія сябры!

Сардэчна віншую дзеячаў кіно і ўсіх, хто звязаны з беларускім кінамастацтвам, з прафесійным святам!

За доўгія гады развіцця айчынны кінематограф прайшоў нялёгкі шлях свайго станаўлення. Былі складаныя перыяды. Важна, што сёння мы можам гаварыць аб традыцыях, якія сфарміраваліся, выдатных фільмах, праслаўленых аўтарах і сапраўдных майстрах, дасягненнях і перспектывах — аб беларускім Нацыянальным кінематографе.

Дзень беларускага кіно — свята не толькі для стваральнікаў, але і для людзей, неабыякавых да лёсу айчыннага кінематографа, для яго прыхільнікаў. Гэта свята для ўсіх работнікаў сферы, бо толькі дзякуючы агульным зладжаным намаганням дасягаецца неабходны вынік: глыбокі фільм з захопленымі водгукамі гледачоў.

У гэты дзень жадаю беларускаму кінематографу перспектыўнага развіцця і працвітання, таленавітых аўтараў і новых цікавых праектаў, жанравай разнастайнасці і духоўнасці. Няхай для кожнага з нас гэты дзень будзе напоўнены той магіяй, якую нясе ў сабе сапраўднае кінамастацтва.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь
Павел ЛАТУШКА

“Шклянка беларускага кіно” — напалову поўная

“Беларускае кіно з аптымізмам глядзіць у будучыню”, — такім быў лейтматыў прэс-канферэнцыі прадстаўнікоў кіраўніцтва сферы айчыннага кінамастацтва, якая адбылася напярэдадні Дня беларускага кіно. Відавочна, у нашых кінавытворцаў існуе шэраг праблем, але нядаўнія заканадаўчыя захады і актыўная дзейнасць па стварэнні сумесных праектаў павінны ўжо ў хуткім часе дапамагчы Беларусі стварыць шэраг цікавых стужак.

Галоўнай падзеяй мінулага кінагода ў Беларусі стала, па словах прадстаўнікоў кіраўніцтва кінагаліны, прыняцце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №567 ад 5 снежня бягучага года “Аб мерах па падтрымцы і стымуляванні развіцця кінематаграфіі”. “Сапраўднай рэвалюцыяй у сферы кінавытворчасці” назваў Указ генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” Алег Сільвановіч. Дзякуючы Указу №567 дзяржава цяпер, пры жаданні, можа фінансаваць праекты з удзелам і прыватных кампаній. Тое павінна спрыяць развіццю прадзюсарскага падыходу да кінавытворчасці. Такім чынам, колькасць вытворцаў кінапрадукту ў Беларусі мае значна павялічыцца, разам з памерам прыватных інвестыцый, якія змогуць удзельнічаць у кінавытворчасці на роўных з дзяржаўнымі сродкамі.

На прэс-канферэнцыі агучылі і такую лічбу: існуюць 32 прыватныя кампаніі, якія на сённяшні дзень працуюць на айчынным рынку кінапаслуг. Чакае кіраўніцтва сферы беларускага кіно і Нацыянальнай кінастудыі большага ўдзелу замежных інвестараў, якія змогуць цяпер актыўна ўдзельнічаць у беларускіх кінапраектах пры ўмове стварэння кампаній-рэзідэнтаў.

Зразумела, што асноўнымі вытворцамі кінапрадукцыі ў нашай краіне на бліжэйшы час застаецца Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм”. На прэс-канферэнцыі паведамілі, што за мінулы год студыя выпусціла 17 адзінак мастацкага, 28 — хранікальна-дакументальнага, 8 мультыплікацыйнага кіно. Апрача творчых характарыстык, кіраўніцтва студыі надае асаблівую ўвагу камерцыйнаму складніку вытворчасці. Як паведаміў журналістам Алег Сільвановіч, большасць кінапраектаў, якія завершаны ці знаходзяцца на сёння ў стадыі вытворчасці, ужо маюць пакупнікоў. Так, новая тэлевізійная чатырохсерыйная стужка Івана Паўлава “Усё, што нам патрэбна” ў хуткім часе будзе паказана па адным з расійскіх каналаў і адным з каналаў беларускага тэлебачання, вядуцца перамовы наконт продажу на іншы расійскі канал меладрамы Віталя Дудзіна “На раздарожжы”. Тэлевізійная стужка “Талаш” па аповесці Якуба Коласа “Дрыгва” будзе паказана ў Беларусі на юбілей класіка нацыянальнай літаратуры.

Па словах Алега Сільвановіча, наступны год абяцае стаць для мастацкага кіно на студыі вельмі плённым: ужо праз некалькі дзён вырашыцца пытанне з адборам стужкі Петэра Сіма “Адзінокі востраў” на Берлінскі міжнародны фестываль, што пройдзе ў лютым, будуць завершаны здымкі экранізацыі аповесці Васіля Быкава “У тумане”, якую ажыццяўляе Сяргей Лазніца, а прадзюсар Аляксандра Сакурава Андрэй Сігле і рэжысёр Канстанцін Лапушанскі пачнуць у Мінску працу над новай стужкай “Роля”. Ва ўсіх гэтых праектах “Беларусьфільм” выступае ў якасці партнёра па вытворчасці, таксама ў стужках задзейнічаны беларускія акцёры.

Што да дакументалістыкі, то, па словах рэдактара студыі “Летапіс” Ірыны Дзям’янавай, перспектывы — таксама неблагія: сёлета тут дэбютавалі адразу пяць маладых рэжысёраў, удалым стала супрацоўніцтва рэжысёра Андрэя Куцілы з вядомым франканямецкім тэлеканалам. У супрацы з ім быў створаны фільм “Мяккі шлях”.

Беларуская аўтарская анімацыя будзе і далей працягваць свае паспяховыя серыі, у тым ліку “Гербы беларускіх гарадоў”, а класіка нашай мультыплікацыі неўзабаве стане даступнай на дысках.

У цэлым, перспектывы сферы кінамастацтва нашай краіны былі ацэнены як станоўчыя.

Антон СІДАРЭНКА

Пагадненне і супрацоўніцтва

13 снежня ў Культурна-дасугавым цэнтры органаў пагранічнай службы ў Мінску адбылася ўрачыстая цырымонія падпісання Пагадненя аб узаемадзеянні і супрацоўніцтве паміж Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным пагранічным камітэтам нашай краіны. У мерапрыемстве прынялі ўдзел міністр культуры Павел Латушка і старшыня Камітэта генерал-маёр Ігар Рачкоўскі.

Дакументам прадугледжана правядзенне разнастайных сумесных мерапрыемстваў, арганізацыя сустрэч з пісьменнікамі, кампазітарамі, акцёрамі, мастакамі на заставах і ў воінскіх частках, ваенных установах адукацыі. Акрамя таго, Міністэрства культуры Беларусі акажа Дзяржпагранкамітэту краіны падтрымку ў правядзенні разнастайных конкурсаў, культурна-відовішчных імпрэз, камплектаванні бібліятэк.

Як зазначыў пад час мерапрыемства старшыня Дзяржпагранкамітэта генерал-маёр Ігар Рачкоўскі, Пагадненне будзе садзейнічаць развіццю і папулярызацыі беларускай культуры сярод ваеннаслужачых, выхаванню іх духоўнасці і патрыятызму, далучэнню пагранічнікаў да гістарычнага мінулага Беларусі, яе традыцый і культуры.

— Паспяховае развіццё нашай краіны, пагранічнага ведамства залежыць ад грамадзянскай пазіцыі ваеннаслужачых, ад іх патрыятызму, — зазначыў Ігар Рачкоўскі. — Таму мы надаем значную ўвагу патрыятычнаму выхаванню пагранічнікаў. І падпісанне Пагаднення аб супрацоўніцтве з Міністэрствам культуры Беларусі дазволіць нам падключыць да гэтага выхавання ўвесь пласт беларускай культуры.

Па словах міністра культуры краіны Паўла Латушкі, супрацоўніцтва Міністэрства і Дзяржпагранкамітэта развіваецца паспяхова і носіць сістэмны характар.

— Дзякуючы намаганням Дзяржпагранкамітэта ў нашай краіне ўзведзены чатыры помнікі, — паведаміў Павел Латушка. — Адзін з іх — унікальны помнік героям-пагранічнікам у Брэсцкай крэпасці — сапраўды выбітны твор манументальнага мастацтва. Адкрыццё манумента прайшло сёлета пры ўдзеле Кіраўніка дзяржавы. Да таго ж, у культурных рэспубліканскіх мерапрыемствах актыўна ўдзельнічае ўзорна-паказальны аркестр пагранічных войск Беларусі. Я цалкам пагаджуся з Ігарам Рачкоўскім у тым, што сёння вельмі важнай з’яўляецца роля афіцэра, пагранічніка як высокакультурнай асобы, якая цікавіцца сучаснай беларускай культурай, ведае нашу гісторыка-культурную спадчыну і з’яўляецца патрыётам нашай дзяржавы.

Пасля падпісання Пагаднення міністр культуры краіны Павел Латушка ўрачыста ўручыў нагрудныя знакі “За ўклад у развіццё культуры Беларусі” старшыні Дзяржпагранкамітэта генерал-маёру Ігару Рачкоўскаму і ягонаму намесніку генерал-маёру Васілю Гарбаценку. Такім жа нагрудным знакам быў узнагароджаны стваральнік скульптурнай кампазіцыі “Героям граніцы, жанчынам і дзецям, якія мужнасцю сваёю крочылі ў бяссмерце”, лаўрэат Ленінскай прэміі, скульптар Валянцін Занковіч. У сваю чаргу, старшыня Дзяржпагранкамітэта генерал-маёр Ігар Рачкоўскі ўручыў знакамітаму творцу нагрудны знак органаў пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь “За дапамогу”.

Ю.Ч.

Конкурс на... Міндоўга

Велічная постаць першага і адзінага караля Вялікага княства літоўскага Міндоўга, увекавечаная ў скульптурнай кампазіцыі, у хуткім часе з’явіцца ў яго родным Навагрудку.

Першым крокам у гэтым кірунку стала абвяшчэнне Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Гродзенскім аблвыканкамам конкурсу на стварэнне эскізных праектаў помніка Міндоўгу.

У выніку плануецца знайсці найбольш выразны вобраз гэтага знакавага для гісторыі нашай краіны чалавека, асоба якога сімвалізуе глыбокія традыцыі існавання беларускай дзяржаўнасці. Невыпадкова арганізатарамі конкурсу выступілі Міністэрства культуры краіны і Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў. Аднак студэнты гэтай навучальнай установы змогуць пакуль што толькі павучыцца і аціаніць работы, прадстаўленыя на конкурс, у якасці гледачоў, паколькі ўдзельнікамі спаборніцтва паводле Палажэння змогуць стаць скульптары, якія ўжо маюць адпаведную прафесійную адукацыю.

Як паведамілі “К” у Міністэрстве культуры, плануецца, што на пачатку сакавіка конкурсныя матэрыялы будуць разгледжаны кампетэнтным журы. Пасля чаго мусіць адбыцца грамадскае абмеркаванне будучага помніка і з бюджэту выдаткуюць неабходныя сродкі на стварэнне скульптурнай кампазіцыі.

Ля каміна ў палацы

Дырэктар Нацыянальнага гістарычна-культурнага музея-запаведніка “Нясвіж” Сяргей Клімаў паведаміў “К”, што для наведвальнікаў адкрыліся камінная, бальная і малая сталовая залы.

Гэтая частка замкавай экспазіцыі другога пускавога комплексу адноўлена яшчэ летам. Названыя залы няблага захаваліся з радзівілаўскіх часін: да прыкладу, у белай бальнай засталіся панэлі, калоны, ляпніна... Па словах Сяргея Клімава, адкрыццё залаў выклікана найперш павышаным інтарэсам наведвальнікаў да замкавай першароднасці.

З гэтай жа нагоды, як распавядае кіраўнік музея-запаведніка, у адноўленых залах камяніцы будзе наладжана анімацыйная навагодняя праграма. У свяце прымуць удзел запрошаныя артысты, музыканты, а таксама мясцовая тэатральная студыя...

Нагадаем, другі пускавы комплекс складаецца з экспазіцыйных і інтэр’ерных залаў, сярод якіх — тэатральная, гетманаўская, залатая, зоркавая, арсенальная, паляўнічая... З цягам часу ў замку з’явіцца рэстаран, гасцінічныя апартаменты.

Трэнд класіка

Год Багдановіча: завяршэнне

Цягам гэтага года па ўсёй Беларусі, гэтаксама як і ў многіх краінах свету, прайшло багата мерапрыемстваў, прысвечаных 120-годдзю з дня нараджэння нашага славутага паэта Максіма Багдановіча. Як паведамляла “К”, увесну быў створаны аргкамітэт па шырокім святкаванні знакавай падзеі на чале з міністрам культуры Беларусі Паўлам Латушкам.

Днямі адбылося падсумаванне вынікаў работы аргкамітэта, пад час якога былі вызначаны як значныя дасягненні, так і пэўныя недапрацоўкі, а таксама вылучаны пэўныя напрамкі ў падрыхтоўцы будучых юбілеяў нашых класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, што будуць адзначацца ў наступным годзе.

Як паведаміў намеснік міністра культуры нашай краіны Тадэвуш Стружэцкі, галоўным вынікам працы аргкамітэта можна лічыць тое, што творчасць Максіма Багдановіча стала бліжэй многім нашым суайчыннікам, аматарам літаратуры з іншых краін.

У прыватнасці, як адзначыла дырэктар Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Таццяна Шэляговіч, выстаўкі, прысвечаныя жыццёваму і творчаму шляху таленавітага творцы праходзілі ў рэгіёнах Беларусі, а таксама ў Літве, Латвіі, Польшчы і Украіне. “Самае галоўнае, яны збіралі вялікую колькасць аматараў беларускай літаратуры,” — зазначыла яна. Акрамя таго, запланаваны выставачныя праекты і ў іншых краінах Еўропы. У гэтым шэрагу міжнародных акцый можна вылучыць і вялікую працу Беларускага радыё. Па словах дырэктара радыё “Беларусь” Навума Гальпяровіча, дзякуючы намаганням журналістаў на хвалях замежнага вяшчання неаднаразова гучалі вершы Багдановіча на розных мовах.

Вельмі важнай аказалася падтрымка беларускімі музейшчыкамі сваіх калег з Ялты ў працы па стварэнні асобнай залы, прысвечанай Максіму Багдановічу, якая мусіць у бліжэйшай перспектыве з’явіцца ў гэтым горадзе. Са значных дасягненняў, што атрымалася ажыццявіць да юбілею паэту, на думку Таццяны Шэляговіч, стала і распрацоўка памятнага медаля, установка і падтрыманне ў належным стане мемарыяльных дошак, дакументальныя ролікі на айчынным тэлебачанні, а таксама стварэнне і размяшчэнне рэкламных плакатаў на сталічных білбордах. І хоць, на думку большасці прадстаўнікоў аргкамітэта, двух білбордаў на двухмільённы горад відавочна не дастаткова, тым не менш, тэндэнцыя бачыцца вельмі пазітыўнай.

Разам з гэтым дырэктар Літаратурнага музея Максіма Багдановіча паведаміла, што ўсё яшчэ працягваецца грамадскае абмеркаванне праекта па аднаўленні дома ў Траецкім прадмесці, дзе нарадзіўся слынны беларускі паэт. Да таго ж, у членаў аргкамітэта маюцца пытанні адносна стварэння помніка Багдановічу ў Гродне, у тым ліку, адносна яго годнага размяшчэння.

Дарэчы

Днямі ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылася прэзентацыя кнігі “Максім Багдановіч: вядомы і невядомы”. Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

У крытыка-архіўны зборнік уключаны даследаванні творчасці Максіма Багдановіча 1910—1940 гадоў. Яго ўкладальнік і аўтар каментарыяў — літаратуразнаўца Ціхан Чарнякевіч. Дзякуючы апублікаваным матэрыялам можна прасачыць, як паэзія класіка беларускай літаратуры ўспрымалася крытыкамі першай паловы XX стагоддзя — Антонам Луцкевічам, Яўхімам Карскім, Аляксандрам Вазнясенскім і іншымі. Акцэнт зроблены на літаратуразнаўчыя працы, якія не перавыдаваліся з часоў першай публікацыі. З архіўных матэрыялаў, змешчаных у кнізе, асобнае месца займае першая кандыдацкая дысертацыя па творчасці беларускага паэта, абароненая Рыгорам Жалезняком у Ленінградзе ў 1940 годзе. У асобным раздзеле прадстаўлены таксама ўспаміны і малавядомыя матэрыялы перапіскі родных і сяброў Максіма Багдановіча.

Выдадзены шэраг навуковых даследаванняў як айчыннымі, так і замежнымі вучонымі. У прыватнасці, літаральна ўчора ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка завяршыла сваю працу Міжнародная навуковая канферэнцыя “Мастацкі свет Максіма Багдановіча: адметнасць, шматграннасць, універсальнасць”. У межах форуму адбылася прэзентацыя “Мультымедыйнага выдання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі “Паэт красы і гармоніі”, а таксама анансаванай “К” энцыклапедыі “Максім Багдановіч”.

К.А.

Пра мерапрыемствы, што завяршалі адзначэнне Года Багдановіча, чытайце на стар. 6,7, 9,10.

Апарат Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні дырэктару Рэдакцыйна-выдавецкай установы “Культура і мастацтва”, галоўнаму рэдактару газеты “Культура” Крушынскай Людміле Аляксееўне з прычыны напаткаўшага гора — смерці маці.

Калектыў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь выказвае словы спачування галоўнаму рэдактару газеты “Культура” Крушынскай Людміле Аляксееўне, яе родным і блізкім з прычыны напаткаўшага гора — смерці маці Соф’і Канстанцінаўны.

Калектыў Рэдакцыйна-выдавецкай установы “Культура і мастацтва” выказвае свае шчырыя спачуванні дырэктару, галоўнаму рэдактару газеты “Культура” Крушынскай Людміле Аляксееўне з прычыны непапраўнай страты — смерці маці.

Супрацоўнікі рэдакцыі газеты “Культура” выказваюць шчырыя і глыбокія спачуванні свайму галоўнаму рэдактару ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю маці Соф’і Канстанцінаўны. Разам з вамі смуткуем і перажываем страту роднага чалавека.

На Шчадрэц — да дуба

Вёска Семежава, што на Капыльшчыне, пазначана на культурнай карце краіны як радзіма “Цароў”.

Рэспубліканская навукова-метадычная рада пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь прапанавала надаць афіцыйны статус гісторыка-культурнай каштоўнасці яшчэ адной праяве нематэрыяльнай спадчыны гэтага краю.

Традыцыі закладнога ткацтва чырвона-белых ручнікоў вядомыя на Капыльшчыне спаконвеку — тут гэтае ўмельства называлі “ў матрушы”. Іх адрадзіў і працягвае Раённы цэнтр ткацтва ў Семежаве, на базе якога не так даўно паўстала “Школа ткачоў”.

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей папоўніўся і яшчэ адным узорам нематэрыяльнай культуры: абрадам “Цягнуць Каляду на дуба”, які здавён уласцівы для вёскі Навіны Бярэзінскага раёна. Сярод шматлікіх іншых інварыяцый Шчадраца гэты яскравы карнавал вылучаецца традыцыяй усталявання Каляды на высокі дуб.

Абедзве гэтыя традыцыі апынуліся пад пагрозай знікнення ў наша бурлівае стагоддзе, але стараннямі энтузіястаў былі адроджаны і цяпер працягваюць сваё існаванне.

Марафоны музыкі

Фестывальная зіма распачынаецца на Беларусі, паводле традыцыі, у Віцебску — Міжнародным музычным фестывалем імя І.Салярцінскага, а музычную эстафету падхопяць брэсцкія “Студзеньскія музычныя вечары”.

Абодва фестывалі — амаль равеснікі: віцебскаму фэсту — дваццаць тры, а брэсцкі — на год старэйшы.

Што да праграмы, дык віцебскі форум прапануе ўсяго шэсць канцэртаў. Гэта менш, чым у мінулыя гады, аднак імёны на іх прадставяць сапраўды важкія. Да таго ж, частку выступленняў фестываль зладзіў для жыхароў Полацка і Наваполацка. Сярод будучых цікавых імпрэз у Віцебскай абласной філармоніі — цэлы музычны кактэйль розных эпох і стыляў акурат сёння прапануе віцябчанам сталічны ансамбль салістаў “Класік-Авангард”. А адным з фартэпіянных акцэнтаў стане закрыццё фестывалю. Яно адбудзецца 23 снежня ў час выступлення заслужанага арыста Расіі Мікалая Луганскага.

Таксама ўжо вызначана праграма “Студзеньскіх музычных вечароў” у Брэсце. Яны распачнуцца 9 студзеня і будуць складацца з 13 канцэртаў музыкантаў з 12 краін. Як зазначаюць арганізатары, адметнасцю сёлетняга фэсту мае стаць выступленне кнопачнага акардэаніста з Кіева Ігара Завадскага, а таксама юнай скрыпачкі з Токіа Манэ Хаторы.

Як і віцебскі форум, “Студзеньскія музычныя вечары” не абмяжуюцца толькі сценамі цэнтральнай залы (ёй, па традыцыі, стане Брэсцкі абласны акадэмічны тэатр драмы): канцэрты маюць адбыцца ў касцёле Уздзіўжання Святога Крыжа, мастацкім музеі Мемарыяльнага комплексу “Брэсцкая крэпасць — герой”, а ўпершыню фэст прыме сцэна Пружанскага ГДК.

Увага!

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады дырэктара ўстановы “Музей “Замкавы комплекс “Мір”;

Тэрмін правядзення конкурсу — з 15 снежня 2011г. па 14 студзеня 2012г.

Патрабаванні да кандыдата:

— мае вышэйшую адукацыю;

— вопыт працы ў музейных установах і музеефікацыі аб’ектаў культурнай спадчыны альбо (і) маркетынгавай дзейнасці (сферы культуры, турызму, адукацыі, эканомікі, юрыспрудэнцыі і інш.).

Асобы, якія жадаюць прыняць удзел у конкурсе, падаюць у конкурсную камісію заяву па адрасе: г. Мінск, праспект Пераможцаў, 11, на імя Міністра культуры.

Да заявы прыкладаюцца наступныя дакументы:

копія пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь (старонка 31) або іншага дакумента, які пацвярджае асобу;

аўтабіяграфія;

асабісты лісток па ўліку кадраў;

копіі дакументаў аб вышэйшай адукацыі, вучоных ступенях і званнях;

характарыстыка з апошняга месца працы;

фатаграфія памерам 30 мм х 40 мм;

праект канцэпцыі развіцця ўстановы “Музей “Замкавы комплекс “Мір”.

Тэрмін падачы дакументаў — да 10.01.2012 г. уключна. **Заявы, якія паступілі без пералічаных дакументаў або пасля 10.01.2012 г., не разглядаюцца.**

Кантактныя тэлефоны: ***204 86 10, 203 90 63; факс: 203 90 45. Адрас: 220004, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 11, каб. 919, 917, 605.***

Аб’ява*

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў

аб’яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

— старшы выкладчык кафедры гуманітарных дысцыплін (гісторыя беларускай літаратуры і беларуская мова);

— старшы выкладчык кафедры інтэр’ера і абсталявання;

— прафесар кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

— дацэнт кафедры малюнка, жывапісу, скульптуры.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб’явы. Заявы і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсе, падаваць на імя рэктара Акадэміі на адрас: 220012, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 81, аддзел кадраў; тэлефон: 292-77-34.

Увага!

Прыкладны пералік

рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія праводзяць абмен пасведчанняў удзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на пасведчанні пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый

Звесткі пададзены ў наступным фармаце: найменне органа(ў), што выдалі пасведчанне / найменне органа(ў), што перарэгістравалі пасведчанне / найменне органа, які будзе ажыццяўляць абмен пасведчанняў / паштовы адрас органа, які будзе праводзіць абмен пасведчанняў (апошнія два пункты — па стане 01.11.2011 г.).

1. Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, Міністэрства будаўніцтва, Мінмантажспецбуд, Белсельбуд, Дзяржбуд, Карпарацыя “Белбуд”, Канцэрн “Белбудмантаж” / Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва / Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва / 220048, г. Мінск, вул. Мяснікова, 39;

2. Міністэрства ўнутраных спраў, Штаб грамадзянскай абароны в/ч 3403, Вышэйшая школа МУС, Мінская сярэдняя школа МУС / Міністэрства ўнутраных спраў / Міністэрства ўнутраных спраў / 220030, г.Мінск, Гарадскі вал, 2;

3. Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі / Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі / Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі / 220050, г. Мінск, вул. Берсана, 16;

4. Міністэрства аховы здароўя / Міністэрства аховы здароўя / Міністэрства аховы здароўя / 220048, г. Мінск, вул. Мяснікова, 39;

5. Міністэрства інфармацыі, Камітэт па спорце, Камітэт па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў, Савет па справах рэлігій / Міністэрства культуры і друку / Міністэрства інфармацыі / 220004, г.Мінск, пр. Пераможцаў, 11;

6. Міністэрства культуры / Міністэрства культуры і друку / Міністэрства культуры / 220004, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 11;

7. Міністэрства лясной гаспадаркі / Міністэрства лясной гаспадаркі / Міністэрства лясной гаспадаркі / 220048, г. Мінск, вул. Мяснікова, 39;

8. Міністэрства абароны, Ансамбль песні і танца ЧБВА / Міністэрства абароны / Міністэрства абароны / 220034, г. Мінск, вул. Камуністычная, 1;

9. Міністэрства народнай адукацыі, Камітэт па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі, Дзяржпатэнт, Камітэт па навуцы і тэхналогіях, Камітэт па справах моладзі, Камітэт па аўтарскіх і сумежных правах / Міністэрства адукацыі і навукі / Міністэрства адукацыі / 220010, г. Мінск, вул. Савецкая, 9;

10. Дзяржкамэкалогія, Камітэт па зямельных рэсурсах, Камітэт рыбааховы, ВА “Беларусьгеалогія” / Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Камгідрамет, ВА “Беларусьгеалогія” / Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя / 220048, г. Мінск, вул. Калектарная, 10;

11. Дзяржкампрам, Камітэт па фармацэўтычнай і мікрабіялагічнай прамысловасці пры Савеце Міністраў, Камітэт хімічнай і мікрабіялагічнай прамысловасці ў складзе Міністэрства прамысловасці / Міністэрства прамысловасці / Міністэрства прамысловасці / 220033, г. Мінск, пр. Партызанскі, 2/4;

12. Міністэрства сувязі і інфарматыкі / Міністэрства сувязі і інфарматыкі / Міністэрства сувязі і інфарматызацыі / 220050, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 10;

13. Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Міністэрства хлебапрадуктаў, Камітэт па хлебапрадуктах, Канцэрн “Палессеводбуд”, Канцэрн “Белводгас”, Канцэрн “Белмеліяводгас”, Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі / Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання / Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання / 220050, г. Мінск, вул. Кірава, 15;

14. Міністэрства гандлю, Канцэрн “Белрэсурсы” / Міністэрства гандлю, Канцэрн “Белрэсурсы” / Міністэрства гандлю / 220050, г. Мінск, вул. Кірава, 8, кор.1;

15. Міністэрства транспарту і камунікацый, Беларуская чыгунка, Беларускае аб’яднанне грамадзянскай авіяцыі, Міндарбуд, ВА “Гомельаблдарбуд”, Камітэт па аўтамабільных дарогах / Міністэрства транспарту і камунікацый, Беларуская чыгунка, Дзяржкамітэт па авіяцыі, Белаўтадар / Міністэрства транспарту і камунікацый / 220029, г. Мінск, вул. Чычэрына, 21;

16. Міністэрства сацыяльнага забеспячэння, Камітэт па сацыяльнай абароне ваеннаслужачых, асоб радавога і начальніцкага складу органаў унутраных спраў, воінаў-інтэрнацыяналістаў, звольненых у запас (адстаўку), і членаў іх сямей / Міністэрства сацыяльнай абароны / Міністэрства працы і сацыяльнай абароны / 220004, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 23/2;

17. Дзяржкампраца / Міністэрства працы / Міністэрства працы і сацыяльнай абароны / 220004, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 23/2;

18. Міністэрства фінансаў, Дзяржстрах / Міністэрства фінансаў, Белдзяржстрах / Міністэрства фінансаў / 220010, г. Мінск, вул. Савецкая, 7;

19. Дзяржкамчарнобыль, Дзяржпраматамнагляд / Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і абароне насельніцтва ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС / Міністэрства па надзвычайных сітуацыях / 220050, г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 5;

20. Дзяржэканомплан, Камітэт цэн, Камітэт па эканамічных пытаннях абароны / Міністэрства эканомікі / Міністэрства эканомікі / 220050, г. Мінск, вул. Берсана, 14;

21. Міністэрства энергетыкі, Беларусэнерга, Захадэлектрагасбуд, БМТ “Белэнергабуд”, БМУ “Белэнергаахова”, Канцэрн “Белпалгаз”, Захадтрансгаз / Міністэрства паліва і энергетыкі, ДВА “Белэнерга”, ДВА “Белпалгаз”, ААТ “Белтрансгаз” / Міністэрства энергетыкі / 220030, г. Мінск, вул. К.Маркса, 14;

22. Міністэрства юстыцыі / Міністэрства юстыцыі / Міністэрства юстыцыі / 220004, г. Мінск, вул. Калектарная, 10;

23. Камітэт дзяржаўнай бяспекі / Камітэт дзяржаўнай бяспекі / Камітэт дзяржаўнай бяспекі / 220623, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 17;

24. Камітэт стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі / Міністэрства адукацыі / Дзяржкамітэт па стандартызацыі / 220053, г. Мінск, Старавіленскі тракт, 93;

25. Галоўнае ўпраўленне памежных войск / Галоўнае ўпраўленне памежных войск / Дзяржаўны памежны камітэт / 220050, г. Мінск, вул. Валадарскага, 24;

26. Дзяржкамнафтапрадукт, Канцэрн “Белнафтахім” /Канцэрн “Белхімнафтапрам”, Канцэрн “Белнафтапрадукт”/ Канцэрн “Белнафтахім” / 220116, г.Мінск, вул. Дзяржынскага, 73;

27. Канцэрн “Беллегпрам”, Міністэрства лёгкай прамысловасці / Канцэрн “Беллегпрам” / Канцэрн “Беллегпрам” / 220004, г.Мінск, вул. К.Цэткін, 4;

28. Канцэрн “Беллеспрам”, Міністэрства лясной прамысловасці / Канцэрн “Беллеспаппрам” / Канцэрн “Беллеспаппрам” / 220030, г. Мінск, вул. К.Маркса, 16.

29. Брэсцкі аблвыканкам, Баранавіцкі гарвыканкам / Брэсцкі аблвыканкам / Брэсцкі аблвыканкам / 224005, г.Брэст, вул. Леніна, 11;

30. Віцебскі аблвыканкам / Віцебскі аблвыканкам / Віцебскі аблвыканкам / 210010, г.Віцебск, вул.Гогаля, 6;

31. Гомельскі аблвыканкам / Гомельскі аблвыканкам / Гомельскі аблвыканкам /246050, г. Гомель, пр.Леніна, 2;

32. Гродзенскі аблвыканкам / Гродзенскі аблвыканкам / Гродзенскі аблвыканкам / 230023, г. Гродна, вул.Ажэшка, 3;

33. Мінскі аблвыканкам / Мінскі аблвыканкам / Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама / 220079, г.Мінск, вул.Скрыганава, 4;

34. Магілёўскі аблвыканкам / Магілёўскі аблвыканкам / Магілёўскі аблвыканкам / 212030, г.Магілёў, вул.Першамайская, 71;

35. Заводскі райвыканкам г.Мінска / Заводскі райвыканкам г.Мінска / Адміністрацыя Заводскага раёна г. Мінска / 220026, г.Мінск ул.Жылуновіча, 17;

36. Ленінскі райвыканкам г.Мінска / Ленінскі райвыканкам г.Мінска / Адміністрацыя Ленінскага раёна г. Мінска / 220006, г.Мінск, вул.Маякоўскага, 83;

37. Маскоўскі райвыканкам г.Мінска / Маскоўскі райвыканкам г.Мінска / Адміністрацыя Маскоўскага раёна г. Мінска / 220036, г.Мінск, вул.Дзяржынскага, 10;

38. Кастрычніцкі райвыканкам г.Мінска / Кастрычніцкі райвыканкам г.Мінска / Адміністрацыя Кастрычніцкага раёна г. Мінска 220039, г.Мінск,вул.Чкалава, 6;

39. Партызанскі райвыканкам г.Мінска / Партызанскі райвыканкам г.Мінска / Адміністрацыя Партызанскага раёна г. Мінска / 220088, г.Мінск, вул.Захарава, 53;

40. Першамайскі райвыканкам г.Мінска / Першамайскі райвыканкам г.Мінска / Адміністрацыя Першамайскага раёна г. Мінска / 220012, г.Мінск, зав.К.Чорнага, 5;

41. Савецкі райвыканкам г.Мінска / Савецкі райвыканкам г.Мінска / Адміністрацыя Савецкага раёна г. Мінска /220013, г.Мінск, вул.Дарашэвіча, 8;

42. Фрунзенскі райвыканкам г.Мінска / Фрунзенскі райвыканкам г.Мінска / Адміністрацыя Фрунзенскага раёна г. Мінска/ 220073, г.Мінск, вул.Кальварыйская, 39;

43. Цэнтральны райвыканкам г.Мінска / Цэнтральны райвыканкам г.Мінска / Адміністрацыя Цэнтральнага раёна г. Мінска/ 220004, г.Мінск, вул.Мельнікайтэ, 6;

44. Мінскі гарвыканкам / Мінскі гарвыканкам / Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта/ 220006, г.Мінск, вул.Маякоўскага, 22.

45. Аддзелы сацзабеспячэння Брэсцкай вобласці / Брэсцкае абласное ўпраўленне сацыяльнай абароны /Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта / 224016, г.Брэст, вул.Гоголя, 71;

46. Аддзелы сацзабеспячэння Віцебскай вобласці / Віцебскае абласное ўпраўленне сацыяльнай абароны / Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта / 210029, г.Віцебск, вул.Праўды, 32;

47. Аддзелы сацзабеспячэння Гомельскай вобласці / Гомельскае абласное ўпраўленне сацыяльнай абароны /Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта / 246050, г. Гомель, зав.Спартака, 2а;

48. Аддзелы сацзабеспячэння Гродзенскай вобласці / Гродзенскае абласное ўпраўленне сацыяльнай абароны / Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта / 230023, г. Гродна, вул.Ажэшка, 3;

49. Аддзелы сацзабеспячэння Мінскай вобласці / Мінскае абласное ўпраўленне сацыяльнай абароны / Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага абласнога выканаўчага камітэта / 220079, г.Мінск, вул.Скрыганава, 4;

50. Аддзелы сацзабеспячэння Магілёўскай вобласці / Магілёўскае абласное ўпраўленне сацыяльнай абароны / Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта / 212030, г.Магілёў, вул.Першамайская, 71;

51. Ваенныя камісарыяты Брэсцкай вобласці / Брэсцкі аблваенкамат / Ваенны камісарыят Брэсцкай вобласці / 224020, г.Брэст, вул.Піянерская,40 / 3;

52. Ваенныя камісарыяты Віцебскай вобласці / Віцебскі аблваенкамат / Ваенны камісарыят Віцебскай вобласці / 210001, г.Віцебск, вул.Ленінградская, 18;

53. Ваенныя камісарыяты Гомельскай вобласці / Гомельскі аблваенкамат / Ваенны камісарыят Гомельскай вобласці / 246050, г.Гомель, вул.Садовая, 10;

54. Ваенныя камісарыяты Гродзенскай вобласці / Гродзенскі аблваенкамат / Ваенны камісарыят Гродзенскай вобласці / 230023, г. Гродна, вул.1 Мая, 8;

55. Ваенныя камісарыяты Мінскай вобласці / Мінскі аблваенкамат / Ваенны камісарыят Мінскай вобласці / 220007, г.Мінск, вул.Фабрычыуса, 36;

56. Ваенныя камісарыяты Магілёўскай вобласці / Магілёўскі аблваенкамат / Ваенны камісарыят Магілёўскай вобласці / 212030, г.Магілёў, вул.Дабралюбава, 1;

57. Ваенныя камісарыяты: Маскоўскага раёна г. Мінска, Ленінскага раёна г. Мінска, Фрунзенскага раёна г. Мінска, Кастрычніцкага раёна г. Мінска, Партызанскага раёна г. Мінска, Заводскага раёна г. Мінска, Цэнтральнага раёна г. Мінска, Першамайскага раёна г. Мінска, Савецкага раёна г.Мінска / Ваенныя камісарыяты: Маскоўскага раёна г.Мінска, Ленінскага раёна г. Мінска, Фрунзенскага раёна г. Мінска, Кастрычніцкага раёна г. Мінска, Партызанскага раёна г. Мінска, Заводскага раёна г. Мінска, Цэнтральнага раёна г. Мінска, Першамайскага раёна г. Мінска, Савецкага раёна г.Мінска / Ваенны камісарыят г.Мінска / 220102, г.Мінск, вул. Ангарская, 8;

58. Белкаапсаюз / Белкаапсаюз / Белкаапсаюз / 220004, г.Мінск, пр.Пераможцаў, 17.

Рэпліка музычнага крытыка з залы

Нарэшце, здзейснілася! 13 снежня ў Палацы Рэспублікі адбылося ўрачыстае ўшанаванне пераможцаў Першай Нацыянальнай музычнай прэміі ў галіне эстраднага мастацтва. Тэлевізійную версію ўзнагароджання і гала-канцэрт можна будзе ўбачыць роўна праз тыдзень, 24-га. А "Залатая калекцыя беларускай эстрады" — праект, накіраваны на захаванне песеннай спадчыны рэспублікі і неад'емны ад уручэння прэміі за год, выйдзе на экраны ажно 7 студзеня, хаця прайшоў у Палацы Рэспублікі 12 снежня. Так што некаторыя вынікі ў чаканні тэлевізійнай трансляцыі можна падводзіць ужо сёння.

Талака ці ўсё ж — міжсабойчык?

Абодва праекты ладзіліся сумесна Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Сталічным тэлебачаннем. Да "Залатой калекцыі..." спрычыніўся таксама Маладзёжны тэатр эстрады. Усё было зроблена, здавалася, каб гэтыя акцыі атрымаліся насамрэч усенароднымі. Для кожнага фарміравалася шматлікае журы, экспертныя саветы, складзеныя з вельмі шаноўных, дасведчаных спецыялістаў, вядомых дзеячаў культуры. Заяўкі на прэмію можна было даслаць самастойна, без усялякіх узгадненняў з творчымі ці кіруючымі арганізацыямі. Удзельнікам мог стаць кожны! Дый галасаванне адбывалася, зноў-такі, талакой: той жа прыз глядацкіх сімпатый вызначаўся праз Інтэрнэт і тэлефонныя званкі ў прамым эфіры. А ў адборы песень для "Залатой калекцыі..." удзельнічалі, як неаднаразова падкрэслівалі арганізатары, цэлыя натоўпы студэнтаў і выкладчыкаў творчых навучальных устаноў, якія маюць непасрэднае дачыненне да эстрады.

Але на справе выходзіла не ўсё так добра, як, пэўна, хацелася б. Пра саму прэмію хоць нейкія звесткі нават большасць журналістаў атрымала толькі на прэс-канферэнцыі ў другой палове кастрычніка. Калі "К" праводзіла апытанне сярод дзеячаў культуры напярэдадні Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне і, пазней, "круглы стол" пад час самога форуму, высвятлялася, што многія патэнцыйныя намінанты даведваліся аб заснаванні такой прэміі... менавіта ад нас. Дый прыём заявак, як вядома, давялося працягнуць, бо, відаць, спачатку колькасць удзельнікаў аказалася вельмі малой.

Некаторыя члены экспертнага савета "Залатой калекцыі...", можа, і дагэтуль не падазраюць, што дзесьці "ўдзельнічалі", бо хтосьці з тых, каму я тэлефанавала, убачыўшы іх прозвішчы на сайце, ні за што не галасавалі, бо папросту іх ніхто не папярэджваў.

Пералік больш як 100 песень, з якіх трэба было абраць 35, утрымліваў таксама шматлікія памылкі. Акрамя ўласна арфаграфічных (пэўна, у спешцы не паспелі праверыць), там меліся пытанні і з факталогіяй: няправільна былі пазначаны імёны і прозвішчы аўтараў. Іншымі словамі, песні адных творцаў прыпісваліся іншым. У беларускай музыцы і так хапае міфаў, звязаных са складанымі гістарычнымі ўмовамі яе развіцця. Навошта ж складаць новыя — тым больш, што называецца, на роўным месцы? Бо наяўнасць тых ці іншых твораў у кампазітараў старэйшага пакалення не адлюстравана, на жаль, у Інтэрнэце, але яе можна праверыць па даведніках. Ці хаця б асабіста — у спецыялістаў.

Падобнае "калекцыянаванне" (а дакладней, "селекцыя") павінна праходзіць рэгулярна. Але толькі цяперашні праект, у свой час ініцыяваны асабіста міністрам культуры Беларусі Паўлам Латушкам, здолеў зрушыць з мёртвай кропкі наша асэнсаванне культурнай спадчыны XX стагоддзя. Разнастайныя праекты, часцей звязаныя з той ці іншай тэматыкай, ужо былі. Але такога, які прэтэндаваў бы на "калекцыйнасць" ды імкнуўся ахапіць усё стагоддзе, пэўна, не існавала. Ідэя — бліскучая. А ўвасабленне?

Калі ад вылучэння 35-ці "калекцыйных" песень да канцэрта, дзе яны павінны прагучаць, праходзіць літаральна некалькі дзён, дык вынік напрошваецца сам сабой. Можа, тыя песні абіраліся, зыходзячы акурат з таго, што магло прагучаць? Гэтак жа дзіўнавата глядзеліся некаторыя пераможцы Нацыянальнай прэміі.

Ацаніць адэкватнасць вынікаў маглі далёка не ўсе, хто сабраўся ў зале. У час уганаравання пераможцаў Нацыянальнай прэміі публіка магла азнаёміцца хіба з імёнамі намінантаў (некаторыя ўвогуле былі прадстаўлены на экране толькі ініцыялам ад імені і прозвішчам, бо цалкам гэтыя даныя не змяшчаліся ў адзін радок), але не з іх дзейнасцю. Прыйшоўшы на гала-канцэрт "непадрыхтаваным", немагчыма было атрымаць ніякіх звестак пра патэнцыйных пераможцаў. Дык на каго быў разлічаны канцэрт? І пра якую папулярызацыю беларускай эстрады можна казаць у такім выпадку? Ці, можа, усё гэта мы атрымаем у тэлеэфіры?

Па-беларуску!

Калі толькі задумвалася Нацыянальная музычная прэмія, многія звязвалі яе з папулярызацыяй беларускамоўных песень, тых творцаў, якія іх ствараюць, тых выканаўцаў, што падобныя песні маюць у сваім рэпертуары. І не ў "дацкім" — а ў штодзённым. Аказалася ж — усяму гэтаму была прысвечана толькі адна намінацыя — "Лепшая песня на беларускай мове". Прычым атрымлівала прыз яе выканаўца Алена Ланская. Уласна аўтары гэтай песні (музыка Уладзіміра Кандрусевіча, словы Вольгі Болдыравай) аказаліся быццам бы ні пры чым: ні яны самі, ні іх партрэты так і не з'явіліся перад гледачом у зале. Добра яшчэ, што хаця б назвалі імёны. Затое ў прозвішчы самой спявачкі пераблыталі націск. Памылкі былі і пры агучванні іншых імёнаў і назваў.

Але самае жудаснае, што папросту скаланула шчырых прыхільнікаў нацыянальнага мастацтва, гэта тое, што ўся цырымонія Нацыянальнай прэміі вялася па-руску. Дзякуй Анатолю Ярмоленку: як старшыня журы ён выступіў па-беларуску. Калі ж называлі членаў журы, на экране з'явілася: "Александр Бадак". Толькі дзякуючы партрэту можна было здагадацца, што пад гэтым змушаным "псеўданімам" схавалі вядомага паэта Алеся Бадака. Падаецца,гэта тое ж самае, што назваць Янку Купалу, скажам, Іванам.

Праўда, пры абвяшчэнні згаданай намінацыі найлепшай беларускамоўнай песні вядучая рэзка перайшла "на мову". Чым выклікала "жарцік" з боку свайго партнёра: маўляў, гэта спецыяльна для...

Але справа не толькі ўласна ў словах. Перайшоўшы на беларускую мову, вядучая, як добрая артыстка, нават тэмбр голасу свайго змяніла, наблізіўшы яго да вобраза гэткай "бабкі з кірмашу". Пэўна, такі гумар? Але смешна ад гэтага чамусьці не было — плакаць хацелася. Можа, вядучыя памант. Бо іх не было ні ў пераліку намінацый, ні, як ні дзіўна, у спісе пераможцаў, што змясціла на сваім сайце СТБ. Народны артыст краіны, прафесар Міхаіл Фінберг і яго Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр былі ўшанаваны "За развіццё традыцый беларускай песні". А Уладзімір Мулявін, пасмяротна, адзначаны прызам "За ўнёсак у развіццё беларускай эстрады". Праўда, з уручэннем гэтай узнагароды выйшла замінка. Вядучыя не маглі ўцяміць, хто яе павінен быў атрымліваць. У рэшце рэшт на сцэну выйшаў Беларускі дзяржаўны ансамбль "Песняры", прыз быў уручаны.

Між тым, нагадаем, прэс-канферэнцыя, прысвечаная Нацыянальнай прэміі, адбылася ў Музеі Уладзіміра Мулявіна, што месціцца ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. І сімвалічнасць гэтага падкрэслівалася неаднойчы. Чаму ж тады запрашэння на ўрачыстасць удава Вялікага Песняра Святлана Пенкіна... так і не атрымала? За тры-чатыры гадзіны да гала-канцэрта ў музей патэлефанавалі з СТБ: маўляў, прыходзьце, толькі спачатку забярыце запрашальнік — у Беларускім саюзе кампазітараў. Але ж хіба так запрашаюць?

Можа, сітуацыю з "беларускасцю" неяк падправіла "Залатая калекманічна, без аніякіх хібаў "карціны", што бачылася з залы. Пэўна, гэта і ёсць прафесіяналізм? Тым больш, што песня была зусім не "дарафееўская": спявачку папрасілі выканаць "Спадчыну" Ігара Лучанка на словы Янкі Купалы, якую звычайна бяруць у рэпертуар спевакі-мужчыны. Але яна зрабіла песню — найвыдатна! А на ўсе мае кампліменты прадзюсар артысткі Юрый Саваш ледзь не пакрыўдзіўся: маўляў, гэта далёка не тое, чаго трэба было дасягнуць. А можа патрабавальнасць — залог творчага даўгалецця і трывалых поспехаў?

Увогуле, прафесійных ва ўсіх сэнсах выступленняў на "Залатой калекцыі..." было зусім няшмат. Але сярод сапраўдных дыяментаў — Пётр Ялфімаў з надзвычай драйвавай "Чырвонай ружай" Уладзіміра Мулявіна на народныя словы, зробленай пераканальна, з густам і яркай творчай індывідуальнасцю. Вядомаму аматарскаму гурту беларускай Беласточчыны "Прымакі", можа, было цяжкавата выступаць адразу пасля Ірыны Дарафеевай, тым больш, што пачалі яны выступленне з яшчэ адной лучанкоўскай песні — "Мой родны кут" на словы Якуба Коласа. Але калі кіраўнік гэтага гурта нашых суайчыннікаў Юрка Астапчук упаў на калені, дараваць можна было ўсё. Не толькі таму, што наступная песня "Прымакоў" — бела-

"Залатая калекцыя..." з караоке,

Дык хто ты, лаўрэат "карпаратыўнага" праекта?



або Нацыянальная музычная прэмія па версіі... статыстаў?

Увогуле, цяперашняя прэмія ў галіне эстраднага мастацтва ахапіла, па-сутнасці, не паўнавартасна эстрадны, але — амаль выключна папсовы сегмент... Цікава, што падобны паварот падзей нават выклікаў прапанову "скараціць" прэмію адно да папулярнай музыкі. А можа, усё наадварот? Можа, трэба пашыраць? Бо эстраднае мастацтва куды больш маштабнае і разнастайнае за ўласна папсу. Яно ахоплівае шмат жанраў, стыляў, кірункаў: хаця б ад рока да фолька.

руская народная "Цячэ вада ў ярок" — прагучала папраўдзе бездакорна. Шчырасць на сцэне — сапраўдны падарунак для публікі! І апошнім часам — з'ява даволі рэдкая. Асабліва, на жаль, калі спяваюць па-беларуску...

Канцэрт "Залатой калекцыі..." часам нагадваў караоке. Былі і песні, амаль цалкам разбураныя новым "адзеннем", калі акампанемент "засланяў" сабой мелодыю. Быў і адкрыты, жудасны фальш, і абсалютныя несупадзенні "вобраза песні" з паводзінамі выканаўцаў. Часам думалася: а ці разумеюць самі артысты, пра што спяваюць? Некаторыя песні былі прадстаўлены так, што пазнаць іх было немагчыма — не таму, што гэта была творчая, нечаканая версія, а таму, што іх перайначылі, зыходзячы з прынцыпу "каб было не так, як раней" — папросту супрацьлегла.

Асобна можна казаць пра гукарэжысуру. Некаторыя песні яшчэ можна было б выратаваць, каб пусціць іх у адшліфаваным ва ўсіх сэнсах... запісе. Пэўна, так і станецца ў тэлеэфіры?

У сцэнаграфіі "Залатой калекцыі..." у вочы кідаліся выявы вялізных кружэлак, што зачынялі праходы, праз якія выходзілі артысты. Але глядзеліся яны ці то гільяцінай, ці то няўмольнымі дзвярыма ў касмічнае вымярэнне. У любым выпадку, сваім чарноццем яны наўрад ці выклікалі пазітыўныя эмоцыі. Зноў-такі, у эфіры іх можна і не акцэнтаваць. Дык гледачы ў зале былі за статыстаў?

На дарожку — выходзьце! Але хто?..

Слова "статысты" неаднаразова гучала і ад саміх артыстаў — у час шэсця па "чырвонай дарожцы", у ролі якой выступалі чорна-белыя "клавішы"-прыступкі лесвіцы ў фае Палаца Рэспублікі. Бо ўсе ішлі натоўпам, безназоўна. І двойчы — каб камеры маглі гэта засняць з абодвух бакоў. Гучала музыка. Як і абяцалі, джазавы ансамбль, струнны квартэт, пасаджаны ледзь не "ў нябёсы", вакальны калектыў, пераапрануты ў "спеўныя дрэвы". Здымалі іх усіх — паасобку. Ігралі ж яны — разам. І хаця змешчаны былі ў розных кутках, гледачы, што прыйшлі ў Палац, наўрад ці маглі нацешыцца агульнай гармоніяй.

Што папраўдзе ў Нацыянальнай прэміі было добрым, дык гэта знешняе афармленне. Вельмі разнастайнымі, цікавымі і часам сапраўды арыгінальнымі былі так званыя "падводкі" да намінацыі, калі выносіўся канверт з імем чарговага пераможцы. Тут былі і спевы, і танцы (прычым ва ўсіх стылях), і цыркавыя ды спартыўныя выступленні, дэманстрацыя мод, малюнкі з пяску... Канверты выносілі Мядзведзь, Бегемот, іх хавалі ў адзенні і прадметах сцэнічнага антуражу... Ды што там казаць! Часам усё гэта, прыдуманае рэжысёрам Вячаславам Паніным, было куды больш цікавым, чым уся астатняя дзея і, галоўнае, самі песні пераможцаў. Дык, можа, трэба было толькі гэта і пакінуць? Тут табе і шоу, і гатовая канцэртная праграма — дарэчы, з музыкай. А вось скласці асобную цікавую праграму адно з пераможных нумароў Нацыянальнай прэміі, пэўна, было б складаней, бо некаторыя выступленні запрошаных на гала-канцэрт гасцей, якіх нават не было сярод намінантаў, часам пераўзыходзілі лаўрэатаў.

А пра адбор песень, якія патрапілі ў "Залатую калекцыю...", і вызначэнне пераможцаў прэміі можна ўвогуле разважаць асобна. Сярод публікі ў зале ўзнікла насцярожанасць: няўжо сімпатычная Ірына Відава магла абысці па колькасці "глядацкіх сімпатый" самога Дзмітрыя Калдуна? І толькі калі апошні атрымаў галоўны прыз — "За лепшую песню", прыхільнікі спевака крыху супакоіліся. Але з "сімпатыямі" было больш ці менш зразумела: за каго тэлефанавалі — той і перамог.

А што было крытэрыем у вызначэнні "Залатой калекцыі..."? Папулярнасць? Пазнавальнасць? Тады чаму ў яе не ўвайшлі многія сапраўдныя хіты, што сталіся ўжо амаль "народнымі" песнямі? І наадварот, некаторыя з "адзначаных" і блізка ніколі не падыходзілі да такой вядомасці. Можа, галоўным крытэрыем была мастацкасць? Адметнасць мелодыкі, арыгінальнасць тэкстаў? Зноў-такі, пад гэтыя азначэнні падыходзяць далёка не ўсе песні-абранніцы. Пэўна, у кожнага былі свае ўласныя крытэрыі? Натуральна. І ўвогуле, як ацэньваць песню? У яе першым выкананні ці ў сучасным "вяртанні"? Ці як музычны матэрыял, перспектыўны для далейшых апрацовак? Што ні кажыце, а пры такіх "размытых" умовах члены экспертнага савета таксама пачувалі сябе ў ролі праслаўтых "статыстаў".

Звернем увагу, што сярод абраных песень не аказалася ніводнай патрыятычнай — нават Уладзіміра Алоўнікава (лучанкоўскія "Спадчына" і "Мой родны кут" усё ж больш лірычныя, "асабістыя"). А сярод тых, што былі прапанаваны для галасавання, — ніводнай пра Вялікую Айчынную вайну. Мабыць, не пісалі іх па-беларуску? Праўда, у апытальніку было прапанавана, калі трэба, унесці свой "дадатак". Толькі хто ж за яго, прабачце, прагаласуе?

Увогуле, большасць абраных песень тычылася папраўдзе залатых (у лепшым сэнсе гэтага слова) 1970—1980-х. Але ў гэтым, між іншым, заслуга тых, хто "праектаваў" гэты росквіт. Найперш, тагачаснага рэдактара радыё і тэлебачання Людмілы Палкоўнікавай, якая папросту замаўляла творцам неабходныя песні, адсочвала тэксты, музыку, аранжыроўкі, запісы, рабіла перадачы і суцэльныя фестывалі, накіраваныя на папулярызацыю беларускай песні. Дык, можа, сёння акурат і не хапае такой намінацыі? І сярод тых жа "музычных журналістаў" павінны быць прадстаўлены не газетчыкі, а супрацоўнікі радыё? Тыя, якія даюць (ці, можа, не даюць, калі ёсць за што) у эфір песні ў іх "першасным" выглядзе — як спалучэнне музыкі і слова. Што ні кажыце, а "карцінка" ў песні з'явілася пазней.

Кампазітары акадэмічных жанраў, дарэчы, даўно зрабілі сваю "Залатую калекцыю...". У Алега Хадоскі ёсць сімфонія "Белая Русь" — гэткая "музычная гісторыя" нашай краіны. Сярэднявечча прадстаўлена знаменным распевам, эпоха барока — кантам, класіцызм і рамантызм — цытатай з оперы Антонія Генрыха Радзівіла "Фауст". А XX стагоддзе — наступнымі песнямі: "Бывайце здаровы" Ісака Любана, "Вы шуміце, бярозы" Эдуарда Ханка, "Майскі вальс" Ігара Лучанка. Хто аспрэчыць гэты выбар? У ім — папраўдзе наша гісторыя. А Дзмітрый Лыбін, напісаўшы "Класік-Авангард-сімфонію", уключыў у яе песні І.Любана і У.Алоўнікава, апрацаваўшы іх у стылі венскіх класікаў. І тым самым спалучыў гісторыю беларускай музыкі з еўрапейскай. Дарэчы, ці задумваўся хто калі, што ў той жа песні "Бывайце здаровы", якая ў гэтай сімфоніі загучала па-мацарціянску, як менуэт "а ля Гайдн", можна заўважыць інтанацыі канта і беларуска-ўкраінскай песні "Нясе Галя воду"? А ўсё таму, што гэта — наша інтанацыйная спадчына, "слоўнік эпохі", які складаецца з запазычанняў мінулых эпох і іншых культур.

Што ж уласна да прэміі — пакуль яна відавочна не дацягнула да ганаровага звання Нацыянальнай. Можа, цырымонія ўсё сапсавала? Але, мабыць, не толькі гэта. Надалей трэба і рыхтаваць усё гэта больш працягла, і ставіцца да ўсяго больш адказна.

Увогуле, цяперашняя прэмія ў галіне эстраднага мастацтва ахапіла, па-сутнасці, не паўнавартасна эстрадны, але амаль выключна папсовы сегмент. Ледзь не адзіным калектывам, які "разбавіў" гэтую тусоўку, аказалася "Троіца", прызнаная лепшым музычным гуртом. Паказальна, што "Троіца" нават не выступіла! Проста выйшла ў поўным складзе на сцэну — з глядзельнай залы. Усе астатнія лаўрэаты выходзілі за ўзнагародамі з-за кулісаў. Цікава, што падобны паварот падзей нават выклікаў прапанову "скараціць" прэмію адно да папулярнай музыкі. А можа, усё наадварот? Можа, трэба пашыраць? Бо эстраднае мастацтва куды больш маштабнае і разнастайнае за ўласна папсу. Яно ахоплівае шмат жанраў, стыляў, кірункаў: хаця б ад рока да фолька.

І яшчэ — пажаданне. Калісьці таленавіты беларускі, а цяпер сусветна знакаміты харэограф Раду Паклітару паставіў на нашай сцэне балет, назва якога была пазычана ў М.Метэрлінка: "Свет не заканчваецца ля дзвярэй дома". Сапраўды, сімвалічная фраза. Бо свет музыкі, паўтаруся, таксама не заканчваецца на парозе эстраднага мастацтва, ён куды шырэйшы. Але (вось парадокс!) менавіта з эстрады музыка пачынаецца — з эстрады ў яе самым шырокім сэнсе як сцэнічнай пляцоўкі. Бо не агучаная, яна не можа дайсці да слухача і застаецца ўсяго толькі "бульбінкамі" нот, складзеных стосам на палічцы. Таму вельмі хацелася б, каб з цягам часу Нацыянальная музычная прэмія сталася не толькі больш дасканалай (гэта і без таго зразумела), але і пашырылася, ахапіўшы іншыя жанры і напрамкі. Можа, побач з акадэмічнай музыкай, дзе заваёвы беларускіх музыкантаў на сёння пакуль куды больш значныя, чымсьці ў галіне поп-музыкі, і наша эстрада "падцягнулася" б і пачала б імкнуцца да прафесіяналізму і, адпаведна, еўрапейскасці, на фоне якой можна не згубіцца толькі з дапамогай індывідуальнасці.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Экстэрнам — "курс маладога сцэнарыста"

"Калядная казка" як будучыня беларускай анімацыі

Айчынная анімацыя бадай што самая паспяховая сфера айчыннага кінамастацтва. Але, як і іншым нашым кінематаграфістам, аніматарам вельмі не стае якасных сцэнарыяў. Таму не дзіўна, што ўсе датычныя да нацыянальнай анімацыі з ўвагай сачылі за ходам Рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу на лепшы сцэнарый для анімацыйнай стужкі, вынікі якога былі падведзены напярэдадні свята айчыннага кіно, а прызёры і дыпламанты ўшанаваны на ўрачыстым вечары ў сталічным кінатэатры "Дом кіно" 16 снежня.

Інтрыга конкурсу трымалася да самага моманту абвяшчэння вынікаў: маладыя сцэнарысты выказалі вялікую цікавасць. У творчым спаборніцтве ўдзельнічала больш за дваццаць драматургічных твораў. Гэта, прынамсі, болей, чым у аналагічных іграных і дакументальных конкурсах, якія прайшлі ў апошнія два гады. Але... першай прэміі не атрымаў ніводзін з удзельнікаў, затое другіх прэмій адразу дзве, як і трэціх, таксама вызначана пяць спецыяльных дыпломаў журы.

Якімі будуць беларускія мультфільмы ў бліжэйшым будучым? Каб адказаць на гэта пытанне, "К" вырашыла звязацца з уладальніцай другой прэміі Рэспубліканскага конкурсу маладых сцэнарыстаў Аленай Беланожка, аўтарам сцэнарыя "Калядная казка". Дарэчы, Алена працуе ў Магілёўскім гарадскім цэнтры культуры і дасугу.

— Алена, дазвольце павіншаваць вас з узнагародай. Якім чынам вы прыйшлі да думкі напісаць сцэнарый анімацыйнай стужкі і прыняць удзел у конкурсе?

— Па прафесіі я — рэжысёр святаў і абрадаў, працую ў гэтай якасці даволі даўно, але паралельна займаюся літаратурнай дзейнасцю. У мяне выйшаў зборнік, які называецца "У кроку ад неба", друкуюся ў перыядычных выданнях, размяшчаю сваю творчасць у Інтэрнэце, актыўна ўдзельнічаю ў літаратурным жыцці, конкурсах. Рыхтую да выдання другі зборнік вершаў, працую над рукапісам рамана. Дарэчы, апошнім часам пішу па-беларуску.

Звярнуцца да сцэнарнага жанру вырашыла таму, што ў мяне ёсць верш, які так і называецца — "Калядная казка". Інфармацыю аб конкурсе знайшла на сайце Міністэрства культуры і падумала: чаму б не паўдзельнічаць? Я ведаю, як не хапае сцэнарнага матэрыялу, і таму заўсёды заклікаю сваіх калег-літаратараў: "Пішыце сцэнарыі, бо калі не мы, то хто будзе гэта рабіць?"

— Але гэты сцэнарый, наколькі я разумею, у вас не першы?

— У 2008 годзе я атрымала прыз пад назвай "Шанц" на сцэнарным конкурсе "Моладзь. Сям'я. Грамадства", які таксама быў зладжаны Міністэрствам культуры краіны. Але над тым матэрыялам трэба было яшчэ папрацаваць. Дарэчы, ён дасюль у архівах Нацыянальнай кінастудыі. Сёлета я вырашыла паспрабаваць напісаць сцэнарый менавіта анімацыйнай стужкі. Спадзяюся, у мяне гэта атрымалася.

— Ці ёсць у вас жаданне працаваць у нацыянальным кіно ў якасці сцэнарыста і далей?

— Так, я планую супрацоўнічаць з "Беларусьфільмам". Мне вельмі пашанцавала з рэдактарам на студыі, якой я прынесла сцэнарый у першую чаргу. Яе завуць Алена Калюнова, і яна адразу ўзялася за матэрыял. Гэта чалавек, які мне ўсё вельмі дакладна растлумачыў, дзякуючы ёй я, так бы мовіць, экстэрнам прайшла "курс маладога сцэнарыста", і "Калядная казка" адбылася менавіта як сцэнарый. І, калі ўсё будзе добра, над ім пачнуць працаваць аніматары.

— На якую анімацыю вы арыентаваліся, калі пісалі "Калядную казку"? Якія "малюнкі" ўзнікалі ў вас падчас працы над сцэнарыем?

— Думаю, гэтыя вобразы былі бліжэй да класічнай савецкай анімацыі, тых старых, "добрых" мульцікаў, на якіх выраслі не адно пакаленне. Што да сучаснай камп'ютарнай тэхналогіі, то яна мне зусім не падабаецца. Хочацца ўбачыць на экране нешта сапраўды жывое, да чаго дакраналася чалавечая рука. З'яўляюся прыхільніцай прыгожага ў мастацтве, таму мне вельмі падабаюцца ранейшыя дыснееўскія маляваныя мультфільмы. Добра я адношуся і да таго, каб усе сцэнарныя дэталі ў анімацыйнай стужцы былі вельмі добра "прапрацаваны". Узорам тут для мяне з'яўляецца тая ж дыснееўская стужка "Геркулес", дзе аўтары шматкроць працавалі са старажытнымі міфамі.

— Да каго з беларускіх рэжысёраў вы хацелі б "патрапіць"?

— Ведаеце, у нас такая моцная школа нацыянальнай анімацыі, што для мяне, як аўтара-пачаткоўцы, будзе цікавым працаваць як з вопытным майстрам, так і з маладымі.

— А якія ў вас наступныя творчыя задумы?

— Я напісала дзве творчыя заяўкі на сцэнарыі анімацыйных стужак, пакуль не ведаю, якім чынам складзецца іх лёс, але на "Беларусьфільме" іх ужо прынялі да разгляду. Тым больш, яны падыходзяць па тэматыцы. Мне неверагодна падабаецца пісаць сцэнарыі — першы раз за жыццё я адчуваю сябе цалкам задаволенай як творчая асоба. Здаецца, я намацала тое, чым хачу займацца. Канешне, тыя масавыя відовішчы, над якімі я працую цяпер, гэта цудоўна, але кіно дае больш магчымасцей для аўтарскага самавыяўлення.

Антон СІДАРЭНКА

Экранны дайджэст

Новыя старонкі класікі

Беларускаму кіно — 87! Напярэдадні чарговай даты заснавання айчыннай кінавытворчасці звычайна падводзяць вынікі пройдзенага перыяду і падсумоўваюць планы на будучыню. З вынікамі нашага кінагода чытач можа азнаёміцца на стар. 7, а вось пра гісторыю і бліжэйшую будучыню нацыянальнага кінамастацтва гаворка ідзе ў матэрыялах гэтага развароту.



"Экран і культурная спадчына Беларусі" — так называецца ўнікальны зборнік матэрыялаў, падрыхтаваны Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук. Ён выйшаў на пачатку снежня ў выдавецтве "Беларуская навука".

Расказаць пра новы зборнік карэспандэнт "К" папрасіў аўтара яго канцэпцыі — загадчыка аддзела кіна- і тэлемастацтва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, кандыдата мастацтвазнаўства Антаніну КАРПІЛАВУ.

— Антаніна Аляксееўна, двухтысячныя гады сталі вельмі актыўным перыядам для вывучэння беларускага кіно. Трэба прыгадаць унікальныя, знакавыя выданні "Усе беларускія фільмы" пад рэдакцыяй Ігара Аўдзеева і Ларысы Зайцавай, вельмі цікавы даведнік "Беларускае кіно. Персаналіі". І вось, новая кніга "Экран і культурная спадчына Беларусі" як своеасаблівае падсумаванне амаль дзевяностагадовага перыяду існавання нашага экраннага мастацтва...

— Так, задума зрабіць такі зборнік узнікла даволі даўно і доўга выношвалася ў нашым інстытуце. Тэма культурнай спадчыны не толькі навуковая — гэтая праца падрыхтавана ў рамках дзейнасці па ажыццяўленні дзяржаўнай палітыкі нашай краіны, накіраванай на ахову культурных здабыткаў нашага народа, пад якімі разумеюць як матэрыяльную, так і духоўную культуру. Іх экранная частка з'яўляецца вельмі важным складнікам сферы. Такім чынам, гэта тэма яшчэ вельмі надзённая.

— Колькасць аўтараў кнігі адразу выклікае павагу. Якім чынам фарміравалася іх кола? Што стала асноўнай тэмай даследавання?

— Напісаў кнігу калектыў, куды ўваходзіць 13 чалавек. Яго аснову склалі акадэмічныя кінаведы, але ёсць і кінакрытыкі, журналісты. Праца ішла хутка, бо амаль ва ўсіх аўтараў мелася шмат назапашаных матэрыялаў. Прычым даследавалася экранная спадчына комплексна: аб'ектамі вывучэння сталіся ігравое, дакументальнае ды анімацыйнае кіно. Патрэбна было стварыць цэласны малюнак асноўных кірункаў раскрыцця тэмы. Даследаваліся тры асноўныя аспекты: "Экран і народная культура", "Экран і прафесійнае мастацтва" (сувязь з літаратурай, жывапісам, музыкай, тэатрам) і непасрэдна "Экранная спадчына".

— Зборнік адрозніваецца наяўнасцю ілюстрацый...

— Так, мы змясцілі шмат фотаздымкаў, кадраў з розных стужак, прычым ілюстрацыі ў кнізе не толькі чорна-белыя, але і каляровыя. На іх зафіксаваны працоўныя моманты здымак, партрэты выбітных дзеячаў беларускага кінамастацтва: рэжысёраў, аператараў, акцёраў. Апошнія — гонар нашага экраннага мастацтва — прадстаўлены ў выданні найбольш багата.

— Хочацца адзначыць, што вам і вашаму калектыву ўдалося захапіць практычна ўсе перыяды існавання нашага кіно.

— Адкрывае кнігу раздзел, падрыхтаваны старэйшынам нашага цэха кіназнаўцаў Анатолем Красінскім, які вельмі сімвалічна называецца "Яны былі першымі". У ім распавядаецца пра першаадкрывальнікаў кінамастацтва на Беларусі — рэжысёраў, сцэнарыстаў, аператараў... Далей ідуць старонкі, прысвечаныя дакументалістыцы, не забыліся мы і на крытыку як адзін з неад'емных складнікаў кінематографа. Кіраўнік Музея гісторыі беларускага кіно Ігар Аўдзееў апісвае ўнікальны вопыт захавання музейнай спадчыны.

Што да сувязі кіно з іншымі відамі мастацтва, дык у кнігу ўвайшлі вельмі цікавыя даследаванні аб супрацоўніцтве нацыянальнага кіно з тэатрам, вялікая ўвага нададзена экранізацыям. Асобна хочацца адзначыць раздзел, напісаны адным з нашых самых паважаных крытыкаў Алай Бабковай. Ён прысвечаны адлюстраванню вайны на экране. Ёсць інфармацыя і аб неажыццёўленным кінапраекце, які рыхтаваў Уладзімір Караткевіч, асобны артыкул пра стужку Валерыя Рубінчыка "Вянок санетаў". Сувязь экрана і народнай культуры прадстаўлена падрабязным разглядам архетыпаў, міфалагічных мадэляў, якімі карысталіся нашы кінематаграфісты пры падрыхтоўцы сваіх твораў.

Хачу адзначыць, што такі аб'ёмны і рознабаковы зборнік-даследаванне ўпершыню з'явіўся ў Беларусі. Зразумела, яго аўтары не прэтэндуюць на стварэнне абсалютна поўнага малюнка ўсёй экраннай спадчыны і культуры на экране.

Антон СІДАРЭНКА

На здымку: Антаніна Карпілава з рэжысёрам Мікалаем Князевым і адказным рэдактарам "Белвідэацэнтра" Аляксандрам Купрыянавым у Інфацэнтры "Культура-інфа".

Фота Юрыя ІВАНОВА

Не заснуць мне без "Сну..." Год Багдановіча: завяршэнне



У дзень нараджэння Максіма Багдановіча тэлеканал "Беларусь 1" паказаў прэм'еру аўтарскага музычнага дакументальнага фільма Надзеі Гаркуновай "Сны Максіма".

Музычны фільм? З гэтым жанравым азначэннем у многіх асацыюецца хіба кінамюзіклы. А "музычны дакументальны"? Сапраўды, наконт "дакументальнасці" тут можна было і паспрачацца: напісанай высокім стылем сінтэзу мастацтваў аказалася гэта стужка. Хіба бывае штосьці падобнае на цяперашнім тэлебачанні?

Да старых "песняроўскіх" запісаў далучыліся два харавыя творы ў выкананні калектыву Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі — бы таямніча сімвалічная рамка, сугучная еўрапейскасці паэта і адначасова яго зусім не плакатнай, а вельмі кранальнай беларускасці. Кожнай з песень папярэднічалі вершы, якія чытаў "сам паэт" у абліччы таленавітага артыста Купалаўскага тэатра Рамана Падалякі, і некалькі літаратуразнаўчых радкоў, што моўчкі месціліся побач. Гэтыя "падводкі"-трыялеты, дапоўненыя навуковымі "каментарыямі", быццам раскрывалі новы, не заўважаны раней сэнс такіх знаёмых кампазіцый "Песняроў" на чале з Уладзімірам Мулявіным. Тая ж "Лявоніха" раптам аказалася сугучнай "Вераніцы" — сваім болем расстання з каханай і прызнаннем за ўсё, што было: "спамяну цябе", "ніколі не забуду цябе я".

Чорна-белая "карцінка" не глядзелася як наўмыснае "рэтра". Гэты прыём дапамагаў засяродзіцца на тонкасцях амузычанай паэзіі і паэтычнай музыкі. А змест каляровых арнаментаў-кветак, што быццам "вышываліся" пад час песень па баках ад "іканапісных" выяў "Песняроў", растлумачыў харавы фінал: спявачкі перадавалі адна адной вышыты беларускі ручнік — сімвал душы нацыі і яе адданага сына Максіма.

Фільм адразу захацелася паглядзець яшчэ ды яшчэ. Вось толькі… хто яго ўвогуле ўбачыў — у будны дзень у 12.30? А між тым, выдадзеныя на дысках, "Сны Максіма" маглі б стаць цудоўным "метадычным дапаможнікам": паглядзеўшы іх з каментарыямі выкладчыка, моладзь атрымала б сапраўдны ўрок патрыятызму. І мастацкасці! А яшчэ ўмення "чытаць" паэтычную і музычную мову сродкамі кіно.

Н.Б.

На здымках: Максім Багдановіч у акцёрскім увасабленні Рамана Падалякі і ў музычным — Уладзіміра Мулявіна.

Сваё прафесійнае свята айчынныя кінатворцы адзначаюць сёння. Адным жа з вынікаў кінагода можна назваць стужку, знятую беларусамі сумесна з эстонскімі і латышскімі калегамі. "Адзінокі востраў" — вельмі цікавы і знакавы для "новага" "Беларусьфільма" праект з удзелам як айчынных артыстаў, так і майстроў экрана з краін Балтыі. Адну з галоўных роляў у карціне выконвае мінская актрыса Вольга ВОДЧЫЦ, асобу якой, бадай, не трэба прадстаўляць шырокай публіцы: на працягу пяці гадоў Вольга адкрывала ранішні тэлеэфір у праграме "Добрай раніцы, Беларусь!". Яшчэ раней яна сыграла колькі роляў на сцэнах сталічных тэатраў, а цяпер актыўна працягвае кінематаграфічную кар'еру: ужо пасля здымак у "Адзінокім востраве" сыграла ў адным з расійскіх серыялаў, а раней прымала ўдзел у японскім праекце, прысвечаным Чарнобыльскай катастрофе.

Вольга Водчыц: "Назіранне" з адрэналінам

"...Востраў" цяпер не самотны

— "Адзінокі востраў" здымала выдатная беларуска-эстонска-латышская каманда на чале з цудоўным рэжысёрам Петэрам Сімам. Ніколі нават не марыла, што буду здымацца ў прафесіянала, які слухаў лекцыі Андрэя Таркоўскага. Прынамсі, здымачныя групы ў нас былі адразу дзве — беларуская і эстонская, бо здымкі з перапынкам на восень і зіму праходзілі ў нас і ў Таліне. Мне пашанцавала пад час здымак пабываць яшчэ ў Рызе. Так цікава, як з Петэрам Сімам, мне не даводзілася працаваць ні з адным кінарэжысёрам. У "Адзінокім востраве" калектыўны галоўны герой. Я выконваю ролю беларускі, якая замужам за эстонцам. Падзеі ў стужцы развіваюцца паралельна адразу некалькімі сюжэтнымі лініямі.

— Вы адчувалі, што працуеце за мяжой? Бо лічыцца, што Эстонія змянілася больш за іншыя краіны былога СССР цягам апошніх дваццаці гадоў.

— Не адчувала, бо падаецца што мы, беларусы, па менталітэце і тэмпераменце вельмі блізкія і эстонцам, і латышам, і літоўцам, мы — еўрапейцы. Наогул, я атрымлівала вялікае задавальненне ад самога працэсу здымак "Адзінокага вострава", калі рэжысёр з аператарам старанна "ставяць святло", рэпеціруюць з акцёрамі. І гэта сёння — вялікая рэдкасць для кіно, бо здымкі серыялаў звычайна праходзяць у вялікай спешцы.

— "Адзінокі востраў", безумоўна, чакае еўрапейскі пракатны лёс. У гэтым сэнсе мы ўсе спадзяемся на "прарыў" для нашага нацыянальнага кіно. Як вам падаецца, ці будуць еўрапейскія гледачы адчуваць, што глядзяць хай і напалову, але беларускае кіно?

— Мне падаецца, што глядач у любой краіне добра адрэагуе на пачуцці, якія мы паспрабавалі перадаць у фільме — каханне, сяброўства, вернасць свайму дому. Цікава, што падчас здымак у Таліне да нашай машыны з надпісам "Беларусьфільм" падышла жанчына, якая, амаль як мая гераіня, выйшла замуж за эстонца і шмат гадоў таму пакінула Беларусь. Ёй даражэй за ўсё было атрымаць няхай такое своеасаблівае, але важнае для яе прывітанне з радзімы...

— Першая ваша роля ў кіно — дзіцячая стужка Маргарыты Касымавай "Зорка Венера". Праз некалькі гадоў быў яшчэ адзін вопыт кінапастаноўкі — у "Анастасіі Слуцкай" выканалі ролю здрадніцы Евы, але, у выніку, трапілі вы на драматычную сцэну...

— Гэта было яшчэ на чацвёртым курсе Акадэміі мастацтваў. Вучылася на курсе Барыса Уторава, у цудоўных педагогаў Уладзіміра Іванова, Алы Швідзевіч, Андрэя Грабёнкіна. Дарэчы, ужо на першым курсе мяне запрашалі на ролю ў серыяле Дзмітрыя Астрахана "Зала чакання", але я адмовілася.

Наш курс апынуўся ў розных тэатрах, а тыя грандыёзныя планы па ўвасабленні найлепшых сусветных мюзіклаў на беларускай сцэне, якія мы выношвалі, засталіся пакуль толькі ў марах. А марылі мы аб знакамітым "Чыкага" Джона Кэндера і Боба Фоса, які нашмат раней за маскоўскую каманду Філіпа Кіркорава пераклалі і паставілі ўласнымі сіламі ў студэнцкім тэатры. Увасобілі мы і "Котак" Вэбера, і амерыканскую версію "Мэры Попінс, да сустрэчы!", і "Гукі музыкі". На жаль, наш тэатр і, самае галоўнае, глядач нават не ведае, што такое сапраўдны мюзікл у сучасным яго разуменні. Мой улюбёны — "Ісус Хрыстос — суперзорка". Дарэчы, калі раптам нехта вырашыць паставіць яго ў Беларусі, гатова прапанаваць свае паслугі ў якасці выканаўцы партыі Марыі Магдалены! А вось мая лепшая сяброўка са студэнцкіх часоў Ілона Казакевіч сёння выконвае галоўную ролю княжны Тараканавай у мюзікле Кіма Брэйтбурга "Блакітная камея".

— Як вам было выходзіць на сцэну "без песні" пасля таго, як трапілі ў Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі?

— А так здарылася, што без песні я амаль і не выходзіла! А на сцэне РТБД даволі часта, здаралася, ці не кожны вечар. Праца там была вельмі цікавай — мы наведалі з гастролямі шмат краін. Вельмі запомніліся гастролі ў Іркуцку: жылі ў гэтым горадзе амаль месяц, сталі амаль роднымі людзьмі, тым больш, усе нашы спектаклі ішлі на роднай матчынай мове. Аказалася, што ў Сібіры жыве вельмі шмат беларусаў. На развітанне беларуская суполка зладзіла нам вячэру ў мясцовым рэстаране беларускай кухні, а мы аддзячылі ім нацыянальнымі танцамі. Велізарным плюсам нашага тэатра было і тое, што можна было непасрэдна кантактаваць з аўтарамі п'ес, у якіх мы ігралі.

Але са сваёй тэатральнай кар'еры больш за іншыя хачу адзначыць спектакль "Адвечная песня" паводле Янкі Купалы. Тут я працавала з Сяргеем Кавальчыкам, дарэчы, рэжысёрам, які вельмі любіць і паважае музыку на сцэне. Гэты спектакль, сапраўды, ішоў у нас на "адным дыханні". А наогул, больш за ўсё, як, дарэчы, і большасці маіх калег, падабаюцца ролі адмоўных персанажаў. Напрыклад, маёй любімай дасюль застаецца роля злой сястры Папялушкі. У "добрых" персанажаў ролі звычайна зусім нецікавыя — такія яны "правільныя", а вось "злыдні" — гэта самае тое...

— Рэзкі паварот вашага жыцця — тэатральную сцэну вы мяняеце на тэлевізійны павільён...

— Так, гэта былі вельмі значныя змены, зыначыўся нават мой жыццёвы рытм: у якасці вядучай праграмы "Добрай раніцы, Беларусь!" мне давялося пяць гадоў запар уставаць а чацвёртай раніцы і праз дзве гадзіны выходзіць у прамы эфір. Але гэта было даволі проста, бо я па сваёй натуры досыць матываваная і пунктуальная асоба. Праўда, зараз я добра разумею: магчымасць як след выспацца дорага каштуе...

— Што вам як актрысе дало тэлебачанне?

— Каласальны жыццёвы вопыт. Магчымасць сустракацца з рознымі людзьмі, слухаць іх, атрымліваць ад іх новыя веды — гэта, наогул, галоўнае ў жыцці, хоць і гучыць досыць гучна. Ведаеце, у нас у Акадэміі мастацтваў быў такі прадмет — "Назіранне". Веданне яго мне вельмі дапамагло падчас прамых эфіраў на тэлебачанні, дзе вельмі часта выручала толькі хуткая рэакцыя на эмоцыі субяседніка. Акцёрская прафесія наогул — экстрэмальная. Праўда, калі займацца нечым сур'ёзна, самаддана, дык любая прафесія мусіць быць экстрэмальнай.

— Прамы эфір немагчыма параўнаць з загадзя адрэпецыраваным спектаклем, тым больш, з кінастужкай...

— А я заўсёды хвалююся, калі выходжу на сцэну, нават калі спектакль ідзе не першы раз! Мае педагогі вучылі, што паміж намі і глядзельнай залай існуе "чацвёртая сцяна", якую трэба абавязкова разбурыць. Тое самае, лічу, існуе і падчас прамога эфіру на тэлебачанні, калі ідзе своеасаблівы абмен энергіяй паміж вядучым і гледачамі. Дарэчы, гэты абмен ніколі не адбываецца аднолькава. Прамы эфір, наогул, прапануе шмат "сюрпрызаў", якія мы з Дзмітрыем Карасём мужна пераносілі: то не запаліцца а шостай раніцы палова асвятлення ў павільёне і мы гадзіну працуем у паўцемры, то спозніцца нехта з запрошаных на эфір гасцей... Такія выпадкі гарантуюць усплёск адрэналіну — адна хвіліна прамога эфіру адпавядае дзесяці хвілінам звычайнага жыцця. Дзякуй нашай камандзе, якой удавалася спраўляцца з усімі праблемамі. Лічу, мне наогул шанцуе ў жыцці на добрых людзей.

Гутарыў Антон СІДАРЭНКА
Фота Юрыя ІВАНОВА

Год Багдановіча: завяршэнне

"Скура" ў іх танчэйшая...

Хто "пасяліўся" ў Дуніна-Марцінкевіча?

14 снежня ў Бабруйску адкрыўся IV Рэспубліканскі фестываль нацыянальнай драматургіі імя В.І.Дуніна-Марцінкевіча. Урачысты феерверк над тэатрам, 14 спектакляў на працягу 5 дзён, тры чыткі, штодзённыя абмеркаванні і "круглыя сталы" — гэта далёка не поўны пералік усіх тых мерапрыемстваў, якія арганізатары фестывалю падрыхтавалі для ўдзельніка ў і гасцей.

Бадай самым яркім падарункам дня адкрыцця стала, як і належыць на фестывалі драматургіі, прэм'ера спектакля "Страцім-лебедзь" па п'есе сучаснага драматурга Юрыя Сохара ў рэжысуры Віталя Баркоўскага, якую ажыццявілі гаспадары пляцоўкі — Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча. Зрэшты, прымеркаваныя да 120-гадовага юбілею з дня нараджэння Максіма Багдановіча, гэтая пастаноўка зусім не сталася "дацкай". У першую чаргу таму, што Віталь Баркоўскі змог знайсці, адчуць і перадаць тыя шчымлівыя інтанацыі тугі па няспраўджанасці магчымага творчага жыцця Паэта, якія, пэўна, не выпадаюць для параднага партрэта.

Белым пухам вішняў рассыпаюцца па сцэне лісты-вершы Багдановіча, злучаючы ў адно прыгажосць гэтага веснавога цвіцення і тугу аб пранізліва-чыстым канцы прыгажосці. І нягледзячы на тое, што ўвесь спектакль, які разгортваецца перад намі, — гэта ланцужок спрэс няспраўджаных мар, жаданняў, імкненняў паэта, перад намі паўстае не ахвяра часу і людзей. У выкананні Яўгена Ракіцкага мы бачым таго самага Страцім-лебедзя, моцнага, гордага, няскоранага перад абставінамі і дробнай зайздрасцю-зласлівасцю. Нездарма суразмоўцам яго, адзіным, з кім Багдановіч размаўляе і думае на роўных, становіцца не хто іншы, як "сусед" Антон Чэхаў (Аляксандр Парфяновіч). Творчы дух аднаго знаходзіць адказы на ўласныя пытанні ў жыцці і смерці другога. І — падтрымку ва ўласнай веры і ахвяраванні сябе Слову, літаратуры.

Зрэшты, ці ж літаратурай займаецца ў спектаклі Максім Багдановіч?! Ён — жыве! Таму і вершы яго, як кожная хвіліна чалавечага жыцця, аказваюцца такімі рознымі: то легкакрыла-натхнёнымі, то, быццам сціснуты стогн, пакутліва-невыноснымі…

У сваіх спектаклях, прысвечаных такім выбітным асобам культуры (свядома не пішу толькі нацыянальнай, бо маштаб іх, без сумнення, значна большы), як Марк Шагал, Хаім Суцін альбо Максім Багдановіч, рэжысёр Віталь Баркоўскі ўмела знаходзіць інтанацыі і фарбы для таго, каб паказаць нам не проста застылы ў стагоддзях манумент творцы. Яго героі — жывыя людзі, са сваімі пачуццямі і перажываннямі. Жывыя, але ж — не звычайныя: магчыма, з-за таго, што "скура" ў іх танчэйшая, перажыванні і пачуцці аказваюцца больш вострымі і яркімі, магчыма таму, што сваім унутраным зрокам — душой — яны "бачаць" больш важныя і важкія рэчы, тое, што закрыта для астатніх. А магчыма таму, што яны не імкнуцца да так званай сацыялізацыі, а галоўным у жыцці бачаць… само жыццё, уменне чуць яго, аддавацца яго радасцям, жарсцям і пакутам. Быць жыццём.

…У сваім прывітальным слове да ўдзельнікаў і гасцей фестывалю міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка зазначыў, што Рэспубліканскі фестываль нацыянальнай драматургіі з'явa надзвычай важная для айчыннай культуры, бо захаванне традыцый, у тым ліку і тэатральных, немагчымае без пільнай увагі да таго, што робіцца ў нашай краіне сёння, чым жывуць айчынныя драматургі, рэжысёры, тэатры. І ён запэўніў, што ўсе тыя часы "ваганняў" адносна неабходнасці гэтага форуму канулі ў Лету: фестываль у Бабруйску мусіць ладзіцца традыцыйна, раз на два гады. Для таго, каб айчынныя аўтары ведалі: яны запатрабаваныя на сваёй зямлі.

Таццяна КОМАНАВА,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Бабруйск — Мінск
На здымках: Яўген Ракіцкі ў ролі Максіма Багдановіча; сцэна са спектакля "Страцім-лебедзь".
Фота Аляксандра ЧУГУЕВА

Удакладненне

У мінулым нумары подпіс да матэрыялу "Шукайце… мужчыну на магістральным маніторынгу" патрэбна чытаць: "сцэна са спектакля тэатра "Валянцін".

І.Семілетаў."Сюжэт ненапісанай казкі".

Н.Голышава."Нацюрморт".

Падзарадка для рэалізму?

Суб'ектыўнае кола вядучага кірунку



Т.Патворава."Час пік. Брэст".

Працягваючы рэалізоўваць канцэпцыю максімальна шырокага прадстаўлення беларускага выяўленчага мастацтва, Палац мастацтва адкрыў у сваіх сценах выстаўку "Суб'ектыўны рэалізм".

Выстаўка "Суб'ектыўны рэалізм" дазваляе атрымаць уяўленне пра тое, у якім стане знаходзіцца сёння рэалістычнае мастацтва, ацаніць патэнцыял далейшага развіцця. На сучасным этапе развіцця беларускага мастацтва неабходна, перш за ўсё, разабрацца з тэрміналагічнымі асаблівасцямі. У значнай ступені гэта тычыцца тэрміна рэалізм. Англійскі жывапісец Джон Канстэбль з уяўнай прастатой раіў мастакам задавольвацца напісаннем толькі таго, што яны бачаць; маўляў, ім варта раз і назаўсёды адмовіцца ад усялякіх класічных, барочных, неакласічных або рамантычных дзівацтваў ды фантазій і проста глядзець вакол, адлюстроўваць тое, што адкрываецца іх воку...

Такім было паходжанне рэалізму. Насамрэч гэты падыход не такі просты, як можа падацца на першы погляд, паколькі, калі справа даходзіць да малюнка, мастакі, сапраўды, вельмі рэдка адлюстроўваюць рэальнасць дзеля яе самой. Памежная лінія, якая праводзіцца зараз паміж рэалізмам і "фармальным" мастацтвам, ляжыць не на стыку мастацкіх плыняў, у літаратурна-сюжэтнай плоскасці. Сёння складваецца сітуацыя, калі "разуменне" сюжэта паступова становіцца асноўным паказчыкам рэалістычнасці твора. І гэта няправільны шлях развіцця, які дазваляе мастаку хавацца за сюжэтам, ігнаруючы прафесійнае ўдасканаленне. Пачынаючы з 1990-х гадоў у творчым асяроддзі вядуцца спрэчкі аб тым, якім шляхам павінна развівацца беларускае выяўленчае мастацтва. За гэты перыяд было прыведзена мноства довадаў на карысць розных меркаванняў, але большасць экспертаў сыходзяцца ў наступным: найважнейшай задачай на цяперашнім этапе развіцця з'яўляецца захаванне і развіццё акадэмічных традыцый у беларускім мастацтве.

Тэматычная шматфігурная кампазіцыя стала найбольш спрэчнай часткай экспазіцыі. Не падлягае сумненню, што развіццё гэтага жанру з'яўляецца важным аспектам для ўсяго напрамку рэалістычнага жывапісу. З іншага боку, стварэнне шматфігурных карцін патрабуе ад мастака найвышэйшага майстэрства і сур'ёзнай акадэмічнай падрыхтоўкі. Першая небяспека, якая падсцерагае мастака, які рызыкнуў звярнуцца да сацыяльнай тэматыкі, заключаецца ў другараднасці мастацкіх задач суадносна з літаратурнымі. З гэтай найскладанай задачай спраўляюцца далёка не ўсё, але пры гэтым можна адзначыць і ўдачы, як, напрыклад, працы Уладзіміра Уродніча і Аляксея Панцюка-Жукоўскага.

Паказальным момантам з'яўляецца тое, што праяўляюць актыўнасць маладыя мастакі. Пераканаўча глядзяцца маладыя аўтары, якім давядзецца вызначаць у найбліжэйшай будучыні твар "новага" беларускага рэалістычнага мастацтва. Сярод іх — Вера Асядоўская, Васіль Пяшкун, Павел Масленікаў, Вольга Мельнік, Ганна Конанава, Усевалад Швайба. Складнікам паспяховага развіцця любога працэсу з'яўляецца "падсілкоўванне" яго новымі ідэямі, і менавіта на маладое пакаленне ўжо цяпер ускладаецца гэтая задача.

Важнае месца ў экспазіцыі заняў пейзаж. Валерый Шкаруба і Мікалай Ісаёнак паказваюць, які шырокі спектр трактоўкі гэтага жанру, што працягвае аказваць найважнейшы ўплыў на развіццё рэалістычнага мастацтва.

Сабраўшы шырокае кола ўдзельнікаў, выстаўка "Суб'ектыўны рэалізм", тым не менш, глядзіцца цэласна. Задачы, якія ставілі перад сабой арганізатары, у цэлым дасягнуты. Пры тым, што творчы працэс заўсёды выклікае мноства супярэчлівых эмоцый, рэалістычнае мастацтва застаецца найважнейшым кірункам беларускай выяўленчай культуры.

Аляксандр ЗІНКЕВІЧ

Ігнацьеўская вастрыня

Пра жыццё ў "кіношных джунглях"

Яўген Ігнацьеў... Выдатны мастак беларускага кіно. Таленавіты жывапісец. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. А яшчэ ён быў цудоўным, камунікабельным чалавекам, якому было што расказаць — і пра сваё доўгае жыццё ў "кіношных джунглях", і пра сяброўства з такімі зорнымі асобамі, як В.Тураў і Г.Шпалікаў, В.Нікіфараў і У.Дзяменцьеў, М.Пташук і В.Рыбараў, Ю.Марухін і У.Бычкоў, Д.Зайцаў і Г.Гарбук, А.Забалоцкі і В.Чацверыкоў...



Я.Ігнацьеў. Пентапціх "Прыезд на хутар".

Як мастак-пастаноўшчык Яўген Ігнацьеў зрабіў шмат кінафільмаў, адзін з якіх — "Праз могілкі" — увайшоў у 1994 г. у лік лепшых 100 фільмаў свету пра вайну. Акрамя кіно, Яўген Аляксеевіч усё жыццё маляваў карціны, пейзажы, нацюрморты ў перапынках паміж кіназдымкамі альбо ў часы "бескарціння", калі быў свабодны ад "калектыўна-вытворчага". А калі выйшаў на пенсію, калі пакінуў кінастудыю "Беларусьфільм", цалкам перайшоў на станковы жывапіс, які стаў яго адзінай любоўю і ўцехай да самых апошніх дзён. А кіно... Кіно засталося ва ўспамінах як, відаць, найлепшая частка яго жыцця. Нагадаю толькі некаторыя яго стужкі: "Трэцяя ракета", "Чорнае сонца", "Магіла льва", "Чужая бацькаўшчына", "Радуніца", "Мяне завуць Арлекіна", "Чакай мяне, Ганна", "Усходні календар", "Полымя", "Час выбраў нас" і, канешне ж, знакамітыя "Людзі на балоце".

Яўген Ігнацьеў належаў да тых майстроў, якія імкнуліся перадаць у кінадэкарацыі характар і своеасаблівасць літаратурнага і рэжысёрскага сцэнарыя, знайсці адэкватнае выяўленне зместу будучага фільма. Канешне, ад першых яго карцін да апошніх — як кажуць, вялікая адлегласць. Але усе гэтыя творы, нягледзячы на розніцу ў падыходах да тэматыкі і сюжэта, валодалі асаблівай ігнацьеўскай вастрынёй кампазіцыйных пабудоў, асаблівай "мяккасцю" яго мастакоўскіх адносін да ўсяго, да чаго дакраналася яго рука: ці то на здымках у павільёне кінастудыі, ці то на натуры альбо ў доўгіх кінаэкспедыцыях. Для яго дэкарацыя — не проста ігравая прастора. Гэта цэлы свет, свет эмацыянальнага ўплыву, свет сацыяльнай арыентацыі, свет жыцця "тыповых характараў" у "тыповых акалічнасцях", прапанаваных рэжысёрам. У той жа час — гэта свет і ігнацьеўскі, які як бы набывае і самастойнае значэнне.

Зусім маленькую частку кінематаграфічнай спадчыны мастака сёння можна пабачыць на выстаўцы твораў Яўгена Ігнацьева, што экспануецца ў Музеі гісторыі беларускага кіно. Экспазіцыя прымеркавана да Дня нашага экраннага мастацтва. Там таксама ёсць і станковы жывапіс, і некаторыя "прадметныя" рэчы мастака, так бы мовіць, пастаянныя спадарожнікі нястомнага шукальніка прыгажосці і для сябе, і для сваіх калег, і, галоўнае, для нас, удзячных гледачоў...

Б.К.

Вызначальнае ў мадэлі

"Скульптура для мяне ёсць пачуццё жыцця..."

Ёсць людзі дзівоснай уласцівасці: здаецца, ведаеш чалавека даўно, а не перастаеш захапляцца яго здольнасцю без прытворства, без гвалту над сабой адкрывацца людзям заўсёды і ва ўсім толькі добрымі бакамі сваёй душы. Так, мастак павінен быць добрым — і ў жыцці, і ў творчасці. Такі Генадзь Мурамцаў — таленавіты скульптар, выдатны педагог, тонкі інтэлектуал, шчыры чалавек, які толькі што адзначыў сваё 80-годдзе цудоўнай выстаўкай у Нацыянальным мастацкім музеі.

Г. Мурамцаў. Жаночая фігура.

Яму ёсць што ўспомніць: даваеннае жыццё ў Мінску, першыя азы рысавання ў Доме піянераў у С.Каткова і ў Доме народнай творчасці ў М.Тарасікава, эвакуацыя ў Цэнтральную Расію разам з бацькамі (яго тата Ілья Аляксеевіч быў выдатным оперным спевакам), вяртанне ў вызваленую беларускую сталіцу, вучоба ў толькі што адкрытым Мінскім мастацкім вучылішчы... А потым — Ленінград, знакамітая "Рэпінка", акадэмічныя вучэбныя майстэрні былога заснавальніка Віцебскага мастацкага тэхнікума М.Керзіна, В.Сакалова, І.Крастоўскага. Дыпломная скульптурная кампазіцыя "Ураджай" атрымала найвышэйшую адзнаку. Ішоў 1958 год. І зноў — вяртанне ў Мінск. Першыя выстаўкі, першы педагагічны вопыт: спачатку — у тым жа мастацкім вучылішчы, потым — у тэатральна-мастацкім інстытуце. Сёлета споўнілася акурат 50 гадоў з таго часу, калі Андрэй Ануфрыевіч Бембель, таксама былы выхаванец ленінградскай мастацкай школы, запрасіў Генадзя Ільіча ў гэты інстытут на пасаду выкладчыка кафедры скульптуры. Так ужо атрымалася, што з таго часу педагогіка і творчасць у Мурамцава заўсёды ішлі побач, ніяк не перашкаджаючы адна адной.

Г.Мурамцаў вядомы ў краіне як скульптар-манументаліст, аўтар помнікаў К.Заслонаву пад Оршай, савецкім салдатам — вызваліцелям Полацка, падпольшчыкам Асінторфа на Віцебшчыне, шматлікіх мемарыяльных дошак. Але, на мой погляд, у станковым партрэце ён дасягнуў найвышэйшых поспехаў. Вось і ў сённяшняй экспазіцыі мастак паказаў свой асабісты погляд на тых людзей (у асноўным — інтэлектуальных прафесій), якія для яго ўяўляюць цікавасць не толькі як знакавыя фігуры свайго часу, але і як прыклады высокага маральнага духу і глыбокай унутранай эмацыйнасці, што ў пластычных адносінах часам пераходзіць у яркую "імпрэсіяністычную" выразную фактуру. "Скульптура для мяне, — кажа Генадзь Ільіч, — ёсць пачуццё жыцця і пачуццё духоўнага пачатку ў ім". Менавіта так. Яго партрэты М.Багдановіча, М.Керзіна, В.Бялыніцкага-Бірулі, А.Паслядовіч, В.Быкава, І.Лучанка, бацькі, І.Мележа, цыкл жаночых вобразаў, створаныя ў розныя гады, пачынаючы з канца 50-х, — даюць яркае ўяўленне аб незвычайным пластычным таленце мастака. Ва ўсіх творах выстаўкі, уключаючы і некаторыя кампазіцыйныя работы кшталту вельмі дынамічных "Закліку" або "Пераможца", адчуваецца натхнёная праца майстра, якая патрабуе надзвычайнай самааддачы, яго ўважлівае і вострае вока, здольнае вылучыць галоўнае, вызначальнае ў мадэлі.

Барыс КРЭПАК

Год Багдановіча: завяршэнне

Барва “Блакітнага санета”

Хто “спаткаўся” з Максімам у Гродне?

На мінулым тыдні беларуская грамадскасць адзначыла 120-годдзе з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Не засталіся ўбаку ад святкаванняў і ў Гродне — тым горадзе, дзе будучы паэт правёў дзіцячыя гады. Свой погляд на асобу Максіма-кніжніка прапанавалі і мастакі горада над Нёманам.

В.Цвірка. “Ракуцёўшчына”.

С.Свістуновіч. “Апокрыф”.

Выстаўка “Я хацеў бы сустрэцца з Вамі…” адкрылася ў Авальнай зале і каплiцы Новага замка. Экспазіцыя створана з фондаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску і Музея Максіма Багдановіча ў Гродне. Выстаўка ўключае графіку, жывапіс, скульптуру, творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама копіі фотаздымкаў, лістоў сям’і Багдановічаў, зборнікі вершаў, біяграфічныя матэрыялы. Да тэмы жыцця і творчасці паэта звярнуліся вядомыя беларускія мастакі, у тым ліку Уладзімір Кожух, Аляксандр Ксяндзоў, Віктар Цвірка, Аляксандр Ларыёнаў...

“Блакітны санет” — так паэтычна называецца выстаўка, прэзентацыя якой адбылася ў Гродзенскай выставачнай зале. Творчы праект, ажыццёўлены спецыяльна да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча, складаецца з работ сямі мастакоў, што ўбачылі чароўны свет паэзіі праз прызму ўласнага светаадчування.

Валянціна Шоба паспрабавала “знайсці сляды Пегаса…” у серыі графічных работ “Мне снілася”, вядома, пад уплывам “Веранікі”. Юрый Якавенка прадставіў свой новы праект з нізкі “Незакончаны санет” — трынаццаць карцін, нібыта трынаццаць вершаваных радкоў недапісанага верша. Уладзімір Панцялееў стварыў скульптуру паэта “Ля сіняй бухты”, а яго сябра з Магілёва Андрэй Вараб’ёў убачыў паэзію ў метале і камені, выканаўшы кампазіцыі “Мара”, “Палёт”, “Пацалунак”.

Вікторыя Ільіна абрала для сябе тэму прыроды: так, убачыўшы карціны “Цёплы вечар”, “Дзічка-груша”, “Лён”, “Кветкі асеннія”, мімаволі ўзгадваеш пейзажную лірыку Багдановіча. На палотнах Аляксандра Сільвановіча “Вянок”, “Белае возера”, “Сон”, “Горад залаты”, “Чырвоныя кветы” адлюстраваны загадкавы, нават казачны свет.

Вершаваныя радкі класіка беларускай літаратуры кранулі нават літоўскага мастака з Друскінінкая Саўлюса Рудзікаса, які вырашыў узяць удзел у гродзенскай выстаўцы. Аўтар ў карціне “Здзіўленне” стварае настрой з санета “Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі…”

Галоўныя ж святочныя мерапрыемствы прайшлі, вядома, у Доме-музеі Максіма Багдановіча. У дзень нараджэння паэта адбылося пасяджэнне літаратурнай гасцінай, тэатралізаваная экскурсія “Марыя Апанасаўна запрашае”, а таксама прэзентацыя выстаўкі “Гродна — калыска паэта”, якая адлюстроўвае горад над Нёманам часоў Максіма Багдановіча вачыма беларускіх мастакоў Яўгена Шунейкі, Антона Вырвы ды іншых майстроў пэндзля.

Дар’я ЧАРКЕС
Гродна

У мінскай галерэі “Ракурс” на другім паверсе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося адкрыццё III фестывалю лічбавага мастацтва “Terra Nova” — форуму, які за нядоўгі час свайго існавання здолеў прыцягнуць увагу аматараў і майстроў лічбавай камеры, кампʼютарных фотарэдактараў і відэапраграм.

Л.Кулік. “Дзяўчына ў металічнай сукенцы”.

“Terra Nova” ў “Ракурсе”

або ракурс новай зямлі?

На адкрыцці форуму дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі пацвердзіў зацікаўленасць бібліятэкі ў мерапрыемствах падобнага кшталту. Ён сказаў: “Мерапрыемства сапраўды іміджавае і, у тым ліку, дзякуючы яму Мінск становіцца адным з цэнтраў лічбавага мастацтва Усходняй Еўропы”. Галоўны куратар фестывалю Фёдар Ястраб зазначыў, што форум развіваецца вельмі хутка, з кожным годам становіцца ўсе больш работ у жанры відэа-арта, кампʼютарнай графікі і лічбавага фота. Усе больш замежных мастакоў прадстаўлена ў Мінску (у гэтым годзе выстаўляюцца творцы з сямі краін — Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы, Кітая, Нарвегіі, Украіны). “Міжнацыянальны дыялог стваральнікаў новага мастацтва — гэта адна з галоўных задач форуму. Аўтарам не ставяцца нейкія тэматычныя рамкі, ўсе прадстаўленыя работы праходзяць жорсткі адбор па якасці, сэнсавай напоўненасці, але творцы могуць выказвацца па ўсіх пытаннях, якія іх хвалююць”, — зазначыў куратар.

Тым не менш, можна вылучыць нейкую ніць, якая існуе ў большасці прадстаўленых на фестывалі работ, — гэта канфлікт: як унутраны, экзістэнцыйны, так і вонкавы — з навакольным грамадствам і, што вельмі сімвалічна, з прыродай, якая ў “лічбавага” чалавека выклікае адначасова трымценне і захапленне.

Сярод прадстаўленых на фестывалі работ можна вылучыць некалькі груп твораў. Адна — гэта працы, зробленыя толькі на кампʼютары, без выкарыстання фотаасновы (напрыклад, “The Bird” Ларысы Кулік, “Хваля?” Анатоля Бяляўскага), другая — лічбавае фота, дзе пасляздымачная апрацоўка выкарыстоўваецца толькі як дадатак дзеля вылучэння найлепшых бакоў здымка (“Выдыхаючае возера” Лолы Підлускай), і трэцяя — самая вялікая група — фотакалажы, дзе здымкі рэальных людзей, мясцін ці рэчаў фантасмагарычным вобразам змяняюцца, пераплятаюцца паміж сабою, уводзяцца ў нейкі іншы, “лічбавы” свет (“Пранікненне салюту з Дня Перамогі” Уладзіміра Сытчанкі, “Гіперсям’я” Наталлі Пятроўскай, безназоўныя працы Эвальдаса Іванаўкуса). Увогуле, на прыкладзе прадстаўленых работ можна вельмі дакладна ўбачыць эвалюцыю лічбавага мастацтва, паколькі сярод іх ёсць як і вельмі захапляльныя, са складанай тэхнікай, але некалькі пуставатыя сэнсава работы (падобных было вельмі шмат гадоў сем таму ў час актыўнага станаўлення лічбавага мастацтва ў нашай краіне), так і больш стрыманыя, але напоўненыя гульнёй зместаў ды большым густам творы. Варта спадзявацца, на наступным, IV-м, фестывалі апошніх будзе яшчэ больш.

Форум “Terra Nova” будзе доўжыцца больш за месяц. За гэты час у розных залах Нацыянальнай бібліятэкі, акрамя пастаяннай выстаўкі, адбудуцца прагляды відэа-арта, праграмы кароткаметражных стужак фестывалю “КіnaVarka”, рэкламных ролікаў, музычных кліпаў ды анімацыі. А 18 студзеня пройдзе ўрачыстае закрыццё фэсту і ўручэнне дыпломаў лаўрэатам па наступных намінацыях: “Лічбавае фота”, “Кампʼютарная графіка”, “Лічбавы жывапіс”, “Відэа-арт”, “Відэакліп музычны”, “Анімацыя”, “Рэкламны ролік”, “Кароткі метр”.

Ф.А.

“Зіма” і іншыя трохкутнікі

Пра рух і эфект ветразя

У сталічнай “Галерэі мастацтва” праходзіць выстаўка жывапісных работ “Шматкроп’е” мастака Андрэя Савіча.

А.Савіч. “Крок за крокам”.

Атрымаўшы адукацыю ў Беларусі і за мяжой, ён выпрацаваў уласную творчую манеру і з’яўляецца арыгінальным прадстаўніком сучаснага беларускага мастацтва. На выстаўцы прадстаўлены новыя эксперыментальныя творы майстра.

Жывапісная творчасць Андрэя Савіча ілюструе сутнасць такога кірунку сучаснага жывапісу, як абстрактны экспрэсіянізм, заснаваны на традыцыях “класічнага” абстрактнага экспрэсіянізму сярэдзіны XX стагоддзя, але з уласцівым сучаснікам пераасэнсаваннем творчай спадчыны прадстаўнікоў мадэрнізму. Мастак знаходзіць цікавыя для сябе формы, трансфармуе іх у іншыя субстанцыі, насычае індывідуальнымі асаблівасцямі. У выніку атрымліваецца зусім новы твор — і па форме, і па змесце.

Калі форма ў працах Андрэя Савіча блізкая па стылістычных асаблівасцях еўрапейскім і амерыканскім майстрам-дадаістам XX стагоддзя, то змест свае карані вядзе ад нацыянальнай глебы: натхненне аўтар чэрпае ў прыродзе роднага краю. Менавіта беларускім краявідам прысвечана вялікая частка яго твораў.

Таксама атрымала водгук тэма, якая хвалявала авангардыстаў пачатку XX стагоддзя. Гаворка пра тэорыю колеру ў жывапісе, да якой Андрэй Савіч звяртаецца даволі часта: “Чырвоны”, “Рух чырвонага да белага”, “Золата”, “Белы”, “Срэбра”. Майстра прыцягваюць формы, якім уласцівая дынаміка, у асноўным, трохкутнай канфігурацыі, але аўтар адлюстроўвае іх статычна: канцэптуальна вырашаючы сутнасць паняцця “рух” — “Вяршыня”, “Трохкутнікі”, “Зламаная дыяганаль”, “Ветразь” і іншыя працы.

Выяўленчыя сродкі Андрэя Савіча вельмі разнастайныя для станковага жывапісу: ён часта выкарыстоўвае чорны колер, уводзячы яго альбо ў тонкую па жывапісным каларыце храматычную, альбо ў эфектную ахраматычную гаму; звяртаецца да буйнарэльефнай фактуры, зверху яе наносячы экспрэсіўную каліграфію. Асновай фармальнай пабудовы кампазіцый з’яўляюцца геаметрычныя або адвольныя па форме плямы. У многіх творах ролю кампазіцыйнага цэнтра іграе яркая каляровая, як можа падацца на першы погляд, клякса (“Рух”, “Маланка”, “Нататнік”). Аднак, як бы густа ні былі насычаны працы хаатычнымі плямамі, размашыстай каліграфіяй, якая мімаволі імкнецца за межы палатна, адчуваецца клопат з боку аўтара аб дэкаратыўным размеркаванні фарбаў, аб спалучальнасці гэтых плямаў. Гэта сведчыць аб надзвычайным дары Андрэя Савіча даводзіць да гледача сваю ідэю ў найбольш лаканічнай форме, даносіць першапачатковую задуму ў яе архетыпе.

Андрэй Савіч лічыць: “Жывапіс як сродак самавыяўлення не саступае музыцы, а пры неабходнасці можа быць больш дакладным, чым слова, бо валодае сваім уласным унікальным сродкам, базавай адзінкай — колерам”. І выстаўка “Шматкроп’е” гэтаму пацвярджэнне: тут мы бачым вялікую любоў да жывапісу, да творчай спадчыны беларускага і замежнага мадэрнізму. “Шматкроп’е” — гэта не канец, а пачатак новага этапу ў эксперыментальнай творчасці мастака, этапу адкрыццяў, пераўтварэнняў і смелых рашэнняў.

Вераніка ЮРЭВІЧ-МАЛАШЧУК

Э.Іванаўскас. “Без назвы”.

Год Багдановіча: завяршэнне

“Апокрыф” — не “прынада”

Максім Багдановіч чарговы раз натхніў кампазітараў сваёй творчасцю. Сапраўднай музычнай падзеяй сталася доўгачаканая прэм’ера “Апокрыфа” Ларысы Сімаковіч у Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Пры ўсёй сваёй значнасці твор не мог не аказацца спрэчным. І гэта добра, бо як можа не выклікаць супярэчных думак тое, што не толькі не кананічна, але і прынцыпова парушае колішнія каноны? І гэта, дарэчы, у традыцыях жанру апокрыфа, які ніколі не быў канонам, таму часта выклікаў пратэст з боку царквы. Новы твор, наадварот, прымаўся публікай настолькі горача, што вымусіў музыкантаў паўтарыць фінал “на біс”. Ён выклікаў таксама думкі і развагі.

Найперш — пра жанр мюзікла-прытчы, дадзены твору аўтарам. Здалося, гэта хутчэй “прынада” для непадрыхтаваных гледачоў: наўрад ці хто з іх спакусіўся б на сучасна выкананую кантату, да якой “Апокрыф” куды бліжэй. Не зусім зразумелымі ўяўлялі-ся і “спасылкі” на стылістыку 1970 — 80-х на пачатку твора. Не цалкам адбудаванай успрымалася і агульная драматургія: часам кантрасныя сутыкненні папросту мільгацелі, не паспеўшы адкласціся ў памяці, некаторыя сцэны так і хацелася крыху працягнуць, зрабіць больш буйнымі, абвастрыць у іх характарнасць. Але кампазітар дасягнула гаманічнага балансу паміж “Версіяй паэта” з узыходзячымі фразамі лоўнага: на першы план выйшлі найпрыгожыя, інтанацыйна “незашмальцаваныя”, адметныя мелодыі з шырокімі ўзыходзячымі фразамі, аддадзеныя Музыку. Ян Жанчак у гэтай партыі ўразіў, як ніколі. Адораны спявак з вялікай будучыняй, ён перасягнуў сябе самога. Ды так, што некаторыя слухачы (нават тыя, якім ужо даводзілася чуць яго раней) здзіўляліся: маўляў, адкуль гэта сусветная зорка?



Так што галоўнай праблемай твора засталася адна: дзе і калі ён яшчэ зможа быць выкананы? Нацыянальны акадэмічны аркестр імя І.Жыновіча, Дзяржаўны камерны хор, фольк-тэатр “Госціца”, шматлікія салісты — і ўсё гэта “толькі адзін раз і толькі для вас”? Можна толькі падзякаваць Міністэрству культуры краіны, якое падтрымала гэта пачынанне (у тым ліку, матэрыяльна) і народнага артыста Беларусі Міхаіла Казінца, які не толькі здзейсніў грандыёзную задуму, але і быў аўтарам ідэі.

А між тым, арганізацыйныя праблемы звычайна аказваюцца для творцаў больш складанымі, чым уласна музычныя. Пра гэта сведчыў філарманічны вечар харавой музыкі на вершы Багдановіча, што прайшоў напярэдадні.

— Бывае куды прасцей напісаць музыку, чым арганізаваць яе выкананне, — усміхнулася ініцыятар канцэрта, кампазітар Аліна Безенсон. — Маёй араторыі “Страцім-лебедзь”, створанай у 2004 годзе, пашчасціла: ужо ў 2005-м яна была запісана на Беларускім радыё — хорам пад кіраўніцтвам легендарнага Віктара Роўды і аркестрам на чале з не менш легендарным і сусветна прызнаным дырыжорам Генадзем Праваторавым. Яны неаднойчы казалі мне пра неабходнасць канцэртнай прэзентацыі гэтага твора на шырокую публіку, але арганізаваць такое выкананне давялося толькі цяпер, ужо пасля іх смерці. Рыхтуючыся да прэм’еры, я перагледзела сваю партытуру і зрабіла другую рэдакцыю, дзе пашырыла ролю аркестра. А галоўнае, падрыхтавала да юбілею паэта новы твор — паэму “Над морам” для барытона, хору, фартэпіяна, арфы і ўдарных інструментаў. Звярнулася і да сваіх калег: у канцэрце прагучалі буйныя творы Андрэя Бандарэнкі, Вячаслава Кузняцова, Віктара Кісценя.

Дададзім, што Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі колькі гадоў таму нават праводзіла студэнцкі конкурс на лепшы харавы твор паводле Багдановіча. А каб сабраць усё, што напісана на вершы паэта ў камерных жанрах, дык музыка гучала б, пэўна, цэлы тыдзень!..

Чып для Чыпаліна

Музычная капэла “Санорус” пад кіраўніцтвам Аляксея Шута радуе дзятву новым музычна-тэатральным пачастункам — “Чыпаліна”.

Рэцэпт прыгатавання наступны: казка Джані Радары + музыка з аднайменнага балета + лялечны тэатр аднаго акцёра. І ўсё гэта — прыблізна за 50 хвілін. Падобная практыка ўвасаблення музыкі для калектыву не навінка. Прыблізна гэтак жа, на сінтэзе мастацтваў, будавалася знаёмства з музыкай балета “Стойкі алавянны салдацік” беларускага кампазітара Марыны Марозавай, з класікай П.Чайкоўскага — “Шчаўкунок”, іншымі творамі. Падобным тэатралізаваным чынам была ўвасоблена і опера Андрэя Мдзівані “Маленькі прынц”, за якую кампазітар быў уганараваны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва. Але галоўнае — праз такія “мабільныя” і адначасова жывыя сімфанічныя паказы да акадэмічнай музыкі далучаецца не толькі сталічная, але і, у першую чаргу, перыферыйная аўдыторыя: капэла выступае і ў маленькіх гарадках, і на сяле, дзе ёсць адпаведныя ўмовы.

Сцэнаграфія “Чыпаліна” — гэта шырма ў выглядзе куба, бакі якога можна гартаць, бы кніжныя старонкі. Астатні “рэквізіт” — вялізныя плоскія лялькі, каляровыя ды вясёлыя. Дзіцячая радасць забяспечана! Вось толькі… аркестр у “Чыпаліна” атрымліваецца на другім плане. І справа не толькі ў празрыстай завесе, якая адмяжоўвае яго ад публікі і лялечнага відовішча. Пэўна, літаратурны тэкст, пры ўсім артыстызме яго пераказу, можна было б скараціць, ахвяраваўшы некаторымі падрабязнасцямі. Пры жаданні бацькі потым перачыталі б гэту казку дзецям самі. Тады ў спектаклі атрымалася б больш не толькі музыкі, але і ўласна эмацыйнага настрою, які яна павінна выклікаць, не застаючыся ўсяго “ілюстрацыяй” да відовішча. Тым больш, што яна таго вартая — з запамінальнымі, выразнымі мелодыямі, у выдатным выкананні.

Фота Пятра ОВАДА

Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр не стамляецца здзіўляць сваіх прыхільнікаў усё новымі прэм’ерамі. “Шчаўкунок” П.Чайкоўскага, фрагмент з якога ўжо ўпрыгожваў балетныя вечары тэатра, цяпер выйшаў цалкам — у вядомай з савецкіх часоў харэаграфіі Васіля Вайнонэна і яе сцэнічнай рэдакцыі Уладзіміра Іванова.

“Шчаўкунок” з тлумачэннем і “навыраст”

Гэты балет, дарэчы, тут ужо ішоў — пад назвай “Драўляны прынц”, каб не перагукацца са “Шчаўкунком”, пастаўленым Валянцінам Елізар’евым у нашым Вялікім тэатры. Але цяперашняя пастаноўка не проста новая, але і крыху іншая. Яе самая, бадай, моцная якасць — прыгожая сцэнаграфія Любові Сідзельнікавай. Заднік сцэны ператвораны ў вялізнае акно. Марозны малюнак на “шкле”, абрысы старадаўняга еўрапейскага горада — усё гэта адразу стварае адчуванне “паветранай” прасторы, асаблівай лёгкасці і прадчування свята. Настройвае на гэта яшчэ ўвертюра. Больш хуткі тэмп, узяты дырыжорам Алегам Лесуном, адточанасць штрыхоў у струнных, грацыёзная імклівасць меладычных ліній — разам з музыкай мы жывем радасным прадчуваннем цуду. Тым больш, што хутка з’яўляецца Чараўнік, які майструе лялькі… Да рэчаіснасці нас вяртае жудасны скрып мэблі, якую выкочваюць у закуліссе. Спачатку думаеш: маўляў, “недапрацовачка выйшла”. Але чым далей, тым больш разумееш, што той “пазамузычны” гук — зусім невыпадковы, а нават вельмі сімвалічны.

Кантраст і нават канфлікт казкі і “правільнай” будзённай рэчаіснасці няўмольна становіцца лейтматывам спектакля. І гэта змяняе саму эстэтыку балета як віду мастацтва! Харэадрама, у жанры якой вырашана пастаноўка, і без таго поўная “жыццёвых тлумачэнняў” — жэстаў. Праз іх перадаецца сам змест. У нашай версіі яна дапаўняецца новымі рэаліямі — той жа вялізнай пасткай, якую Маша разам з лялькай Балерынай выкочвае на сцэну і… запіхвае туды ваяўнічага Каралеча мышэй. Перамога! Вось толькі — чаго над чым?

Падобная харэаграфічная мова, якая ўсяму дае рэальнае “апраўданне” і тым самым вучыць мысліць выключна рэалістычна, уводзіць не толькі ад фантасмагорыі, якой поўніцца паэтыка Гофмана (усё ж яго казка, хай і адаптаваная, пакладзена ў аснову!), але і нават ад рамантыкі. Але калі ўжо ўсё тлумачыцца так літаральна, дык як трэба разумець Па-дэ-дэ, дзе акрамя дваіх закаханых удзельнічаюць, паводле В.Вайнонэна, яшчэ чацвёра жаніхоў, якія перадаюць Машу “з рук у рукі”? Тым не менш, часам гэткая “матэрыялізацыя” балетнасці сапраўды дапамагае. Строі Сняжынак, да прыкладу, дапаўняюцца мяккімі шарыкамі, што звісаюць ад пляча да кісці кожнай артысткі. І мы адразу разумеем: перад намі не празрыстыя, няўлоўныя Сняжынкі, а добра збітыя снежкі — іх Вальс таму сведчаннем.

Гармонія паміж чараўніцтвам і рэальнасцю дасягаецца ў спектаклі вельмі проста. Калі дзеянне адбываецца “ў жыцці”, мы больш зачараваны выкананнем. Радуемся мяккай пластыцы Машы (Міку Сузукі), якая нагадвае нават не падлетка, а дзяўчынку-дашкольніцу, максімум — малодшую школьніцу. Адзначаем чараўніцтва Віталя Краснаглазава — не толькі як танцоўшчыка, але і як артыста, які настолькі добра засвоіў “лялькаваджэнне”, што мог бы працаваць паралельна ў лялечным тэатры.

Калі ж героі трапляюць у чароўную краіну, мы пачынаем так за іх хвалявацца, што становіцца не да зачараванняў. Дый аркестр становіцца ўсё менш збалансаваным, у ігры музыкантаў з’яўляецца механічнасць замест былога палёту. І хаця Людміла Кісялёва, пераўвасобіўшыся з маладой, поўнай любові да мужа і дачкі Маці Машы ў загадкавую ўсходнюю прыгажуню, яшчэ больш вабіць пластычнасцю і “стрэламі вачэй”, а Кітайскі танец захапляе скокамі Ігара Вяршыніна, Пастараль (Танец пастушкоў) гучыць амаль трагічна, дый у танцы застаецца хіба лірыка — без дамесу грацыі і хітрынкі. У знакамітым Па-дэ-дэ Машы і Прынца пануе хіба адна эмоцыя — школьная: зрабіць усё правільна, без памылак. Якое ўжо тут каханне? Для фотагенічнага юнага бландзіна Дзмітрыя Лазовіка гэта партыя яшчэ крыху “навыраст”. Але артысты так стараюцца, што сумневу няма: усё ў іх атрымаецца! Бо ўзысці да вяршынь балетнай класікі, не адолеўшы яе першых прыступак, немагчыма.

Такі балет, безумоўна, неабходны для выхавання трупы. Дый сваю мэтавую аўдыторыю, як пацвердзілі прэм’ерныя паказы, ён мае. Спектакль прызначаны, найперш, для дзяўчынак — аднагодак гераіні — і іх матуль, якія, магчыма, таксама ўсё яшчэ чакаюць свайго сапраўднага прынца.

На здымку: сцэна з балета “Шчаўкунок”

Фота Сяргея СУЛАЯ

А ў меню сталіцы — адно “аліўе”...

Чаму Мінск па-за спісам святочных тур-івэнтаў?

Нашы традыцыі святкавання Новага года, чыя барада даўжэйшая за “асобую прыкмету” Дзеда Мароза, неўзабаве ўжо можна будзе ўносіць у спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Але... часам успрымаеш усур’ёз зашмальцаваную фразу пра “ноч цудаў і дзівосаў”. І таму многім хочацца правесці яе неяк незвычайна — ці, прынамсі, не так, як летась. Некаторыя шукаюць арыгінальныя варыянты на радзіме, іншыя выпраўляюцца ў падарожжа... Індустрыя турызму і забаваў тонка адчувае гэтыя чалавечыя памкненні — навагодняя ноч яе “год корміць”.

Чамусьці такія думкі выклікала ў мяне знаёмства з планам навагодніх культурна-забаўляльных мерапрыемстваў у Мінску. Як распавёў на нядаўняй прэс-канферэнцыі намеснік начальніка ўпраўлення Мінгарвыканкама Сяргей Мядзведзеў, сёлета горад прапануе сваім жыхарам і гасцям каля 80 такіх імпрэзаў — на некалькі дзясяткаў болей, чым летась.

Здавалася б, сама колькасць у дадзеным выпадку павінна была абумовіць разнастайнасць. Але зірнуўшы ў прапанаванае “меню”, можна лёгка прыйсці да высновы, што выбіраць там, па вялікім рахунку, няма з чаго. Святочная навагодняя праграма “З Новым годам, сталіца!”, навагоднія масавыя гулянні “З Новым годам!”, святочная праграма для дзяцей і бацькоў “Прывітанне, Новы год!” etc. — гэта не што іншае, як увасабленні традыцыйнага фармату “ёлачак”. Экзатычныя пальмы альбо шляхетныя туі ў гэты лес не патрапілі.

У тым выпадку, калі дадзеныя імпрэзы пройдуць на добрым узроўні, кансерватыўны “сярэднестатыстычны” спажывец будзе задаволены. Іншыя — наўрад ці. І ўжо зусім малаверагодна, што гэтае “меню” будзе да густу тым турыстам, якія вырашаць сустрэць Новы год у Мінску ды іншых беларускіх гарадах. Бо салат “аліўе” можна паесці і дома, а ў святочным падарожжы хацелася б пакаштаваць нейкіх больш арыгінальных “страваў”.

Праграма не прадугледжвае...

Завядзёнка сустрэць Новы год у замежным прыгожым горадзе для нас зразумелая. І з нядаўняга часу палка мае абодва канцы: едзем не толькі мы, але і да нас, прычым усё болей ды ахвотней. Не даяце веры? Тады вось вам факты. Айчынная турфірма, якая найбольш актыўна “адкрывае” нашу краіну для турыстаў з суседніх краін (і перадусім — Расіі), сёлета падрыхтавала ажно 25 разнастайных навагодніх праграм, якія прапануюць сустрэць свята не толькі ў Мінску, але таксама і ў Гродне ды Брэсце. Гэтыя туры нельга назваць бюджэтнымі — за тыя самыя дзве-тры сотні еўра (без уліку дарогі ды святочнай бяседы) можна добра “панавагодзіць” і ў любой з прыбалтыйскіх сталіц. І тым не менш...

— Ужо сёння можна прагназаваць, што попыт перавысіць прапанову, — кажа дырэктар фірмы Галіна Патаева.

Толькі адзін гэты аператар за калядны час прывязе ў нашу краіну болей за тры тысячы замежных турыстаў! Тлумачыць поспех можна рознымі фактарамі: добрым іміджам Беларусі, эфектам “сарафаннага радыё” (водгукі расіян на Інтэрнэт-форумах — спрэс станоўчыя!), рэпутацыяй самой фірмы і яе ўменнем падаць і прадаць свой тавар... Але наўрад ці ў гэты пералік патрапяць і яркія навагоднія турівэнты. Чаму? Глядзі вышэй.

— Безумоўна, для нас такія імпрэзы вельмі патрэбныя, — кажа Галіна Патаева. — Сёння нам іх вельмі нестае. Але падкрэслю: бракуе менавіта імпрэзаў густоўных ды якасных.

Патрапіўшы каляднай парой у Мюнхен альбо Вену, турыст атрымлівае задавальненне ад самастойнага і нязмушанага шпацыру па цэнтры гэтых гарадоў — з разнастайнымі бятлемамі-шопкамі, традыцыйнымі кірмашамі з глінтвейнам, жывой музыкай... Праграма тураў на Беларусь “вольны час” амаль не прадугледжвае.

— Працуючы тут, сёння трэба разлічваць менавіта на ўласныя сілы, усё арганізоўваць самім, — кажа Галіна Патаева. — Хаця, зразумела, мы выкарыстоўваем і тыя ўдалыя напрацоўкі, якія добра ўпісваюцца ў канву экскурсій. Нас не цікавіць “папса”, не цікавіць і псеўданародны кіч, які часам выдаецца за аўтэнтыку. Іншая справа — той жа фальклор, альбо, скажам, культура шляхты, пададзеныя сапраўды на высокім узроўні.

Гісторыка-культурны складнік не проста прысутнічае ў кожнай з 25 навагодніх праграм — па сутнасці, ён праходзіць “чырвонай ніткай”. І справа тут, мабыць, не толькі ў патрыятызме, але і ў прагматызме. Аператар мае дастаткова досведу, каб беспамылкова вызначаць прыярытэты. І калі ён кажа, што патрабавальных турыстаў у нашым краі вабіць перадусім мінуўшчына часоў ВКЛ, а таксама аўтэнтычная народная культура, яму можна даць веры.

Таму “навагоднія” турысты пакатаюцца на санях у Дудутках (калі пашчасціць з надвор’ем), паглядзяць анімацыю ў Лідскім замку, завітаюць ва ўнікальны храм у Мураванцы, не абмінуць, вядома, і Міра з Нясвіжам... А вось наведванне хаця б адной з гарадскіх імпрэз у Мінску, Гродне альбо Брэсце ў праграме не значыцца. Хаця такія пункты просяцца туды самі сабою. Аглядную экскурсію па сталіцы, якая пройдзе 31 снежня, завершыць арганны канцэрт у Архікатэдры Найсвяцейшай Панны Марыі. Выбар густоўны, але... усё ж трохі дзіўны для пярэдадня Новага года. Тым болей, на безальтэрнатыўнай аснове. “А што яшчэ мы маглі бы прапанаваць сваім гасцям у такі час?” — запыталася ў адказ Галіна Патаева.

“Наш адказ” Дзеду Марозу

Пару гадоў таму ў Латвіі задумаліся аб павелічэнні аб’ёму ўязнога турызму. Прыблізна ў гэты час з нетраў мінуўшчыны быў выцягнуты дакументальна пацверджаны факт: аказваецца, радзімай каляднай ёлкі з’яўляецца менавіта Рыга. А тут раптам прыспеў і яе 500-гадовы юбілей — акурат год таму. З гэтай нагоды была запушчана маштабная рэкламная кампанія на рынках суседніх краін. І тут раптам выявілася, што дакладна такую самую прынаду для турыстаў летась падрыхтавалі і піяршчыкі з Берліна! Болей за тое — радзімай ёлкі лічаць сябе і Страсбург, і Талін... Але самі турысты наўрад ці надта пераймаюцца высвятленнем ісціны. І хапае іх на ўсе гэтыя “радзімы”!

Зрэшты, Беларусь таксама можа пахваліцца сваім узорам навагодняга крэатыву. Зюзя Паазерскі “матэрыялізаваўся” на Пастаўшчыне ў 2005 годзе — і вокамгненна зрабіўся знакамітасцю! Яго “татам” стаў дырэктар мясцовай турфірмы Ягор Шушкевіч. А “мамай” — супрацоўніца раённага метадычнага цэнтра Людміла Чатовіч. Дзякуючы такому дзяржаўна-прыватнаму партнёрству ў праекце былі ўдала пераплецены розныя складнікі — камерцыйны і культурны, гістарычны і забаўляльны.

— Некаторыя лічаць Зюзю прыдумкай, але ж насамрэч у нас на Пастаўшчыне старыя людзі і пагэтуль згадваюць гэтае імя, — кажа Людміла Чатовіч.

Для раскруткі Зюзі не спатрэбілася асаблівых сродкаў ды высілкаў. Журналісты ахвотна ўхапіліся за гэтую экзотыку. Праект, які распачынаўся на лакальным узроўні, набыў вядомасць не толькі ў краіне, але нават і па-за яе межамі. І пачаў прыносіць адчувальныя дывідэнды. Турысты павалілі тысячамі, сядзіба Зюзі абрасла адпаведнай па духу інфраструктурай: карчмой, кірмашом рамёстваў...

Мабыць, менавіта камерцыйны фактар і стаў галоўнай прычынай разладу партнёрства. Летась турфірма адмовілася ад супрацоўніцтва з аддзелам культуры, вырашыўшы працягваць праект саматужна. Крэатыўны ўнёсак сцэнарыста ў ім, вядома, застаўся — Зюзі нікуды ад яго не падзецца. Зусім “палюбоўна” разысціся ў дадзены выпадку не ўдалося, але работнікі культуры не сталі ўпарта даводзіць свае аўтарскія правы на Зюзю і ўжо гатовы прэзентаваць новы прадукт, прысвечаны традыцыям лазні ў кантэксце аграгурызму.

Зусім не дзівіць, што нядаўна на Полаччыне з’явіўся свой “міфалагічны брэнд” — Лясун з уласнай сядзібай. Дзівіць тут акурат іншае: чаму такія праекты не пачалі расці, бы грыбы? Здавалася б, прыклад Пастаўшчыны павінен быць “заразлівым”: ён сведчыць, што арыгінальны, прыцягальны для турыстаў і камерцыйна паспяховы турпрадукт можна стварыць уласнымі сіламі ды без касмічных выдаткаў.

І гутарка тут, вядома, не пра “кланіраванне” альбо плагіят. Перайманне досведу — гэта ўкараненне яўна выйгрышнага “ноу-хау” на ўласным, аўтэнтычным матэрыяле.

У мінулыя гады ідэі стварэння сваіх навагодніх “фішак” неаднаразова анансавалі і работнікі культуры з іншых куткоў краіны. Але на “фінішную прамую” гэтыя задумы чамусьці не выйшлі...

І, між іншым, ва ўжо згаданым плане мінскіх мерапрыемстваў старадаўняя (і бадай “брэндавая”) беларуская традыцыя калядак прадстаўлена ўсяго некалькімі пунктамі “раённага маштабу”, прычым адзін з іх прапануе “бліны ды аладкі” чамусьці... акурат на посную каталіцкую Куццю.

Гістарычны “сюр”

Зрэшты, рынкавая ніша пустой не бывае. І менавіта таму самі турфірмы сёлета як ніколі актыўна сталі яе запаўняць, не чакаючы, пакуль гэта зробіць хто іншы. Праз Крэўскі замак і кляштар у Барунах у навагодні час пройдуць адразу дзве арыгінальныя анімацыйныя праграмы.

— Звычайна нашы тэматычныя анімацыі прывязаны да пэўных гістарычных падзей, але гэтым разам, зважаючы на святочны фармат, сюжэт будзе ўтрымліваць элементы “сюру” — але, вядома, таксама з ухілам і ў мінуўшчыну, і ў нацыянальныя традыцыі, — распавядае дырэктар адной з турфірм Аляксандр Варыкіш.

Канцэптуальна яго сцэнарый нагадвае звыклыя нам па дзіцячых ранішніках пошукі Дзеда Мароза, дзе станоўчым героям, як заўсёды, перашкаджаюць злыя рабаўнікі. Адметнасць гэтай казкі менавіта ў тым, што “архетыпічны” сюжэт тут пабудаваны менавіта на айчынным матэрыяле. Ролю Дзеда Мароза выконвае яго правобраз Святы Мікола, а замест “касмапалітычных” рабаўнікоў гледачы ўбачаць шайку тутэйшага шляхціца Крываноса.

— У сваім сцэнарыі я паспрабаваў спалучыць як мага болей атракцыйных элементаў: коні, стрэлы, фаер-шоу, бойка на шаблях... — распавядае Аляксандр Варыкіш.

Звярнуў увагу на адну акалічнасць: бойка з рабаўнікамі адбываецца ля руінаў царквы Перамянення Гасподняга ў вёсцы Новаспаск. Рэшткі базыльянскага храма XVIII стагоддзя, які быў зруйнаваны яшчэ ў гады Першай сусветнай вайны, раней ніколі не траплялі ў арганізаваныя маршруты. Але сцэнарый анімацыйнай праграмы дазволіць ім упершыню стаць тураб’ектам.

Каштуе гэтая анімацыйная праграма нятанна — прыкладна ўдвая даражэй за “звычайную” экскурсію. На сям’ю з чатырох чалавек выйдзе каля мільёна рублёў! Але попыт усё адно даволі вялікі. Тым болей, каляднай парой людзі гатовы дазволіць сабе тыя выдаткі на адпачынак, якія ў звыклы час пададуцца раскошай.

Здавалася б, гэты прадукт разлічаны перадусім на айчыннага спажыўца — надта ён укаранёны менавіта ў беларускую мінуўшчыну. Ды, як адзначыў Аляксандр Варыкіш, ужо пасля Новага года ладную частку экскурсантаў будуць складаць расіяне, якія прыедуць на Беларусь падчас сваіх калядных канікул. Аказваецца, наша гісторыя таксама для іх цікавая!

■■■

Многім гарадам Еўропы, мабыць, нават і не трэба вынаходзіць свае “каляднyя фішкі” — яны там існуюць ужо не адно стагоддзе. Мінск, на жаль, у гэты спіс не ўвахоціць. І менавіта таму побач з традыцыйнымі “ёлачкамі” вельмі хочацца ўбачыць і нейкія крэатыўныя навінкі. Хай сабе гэта будуць апеляцыі да “сівой даўніны”, альбо рэтра-стылізацыі навагодніх традыцый 20-ых, 50-ых, 70-ых, альбо смелыя ідэі, увасобленыя з “чыстага аркуша”, альбо... Прасторы для задумаў тут папраўдзе багата.

Без сумневу, такіх арыгінальных навагодніх “брэндаў” патрабуюць не толькі турысты, але і самі жыхары. Хаця б дзеля разнастайнасці і тых новых уражанняў, якіх асабліва чакаеш менавіта ад гэтага свята.

Ілья СВІРЫН

Апытанне “К”: чаго не стае для...

Опера ды аэраплан — ідэя “пад ёлку”

Менш чым за два тыдні да навагодніх урачыстасцей карэспандэнты “К” пацікавіліся ў моладзі Мінска, якім хочацца ўбачыць святочны горад, чаго чакаюць маладыя людзі ад масавых мерапрыемстваў у сталіцы. Акрамя таго, рэспандэнты падзяліліся сваім бачаннем баўлення вольнага часу на вуліцах і плошчах у першыя дні 2012-га.

Пагутарыўшы з пяццю дзясяткамі маладых мінчан, выявіліся агульныя тэндэнцыі ў грамадскім разуменні “яскравага запамінальнага свята”, якімі і мусяць быць навагоднія і калядныя дні, што ладзяцца ў кожным сталічным мікрараёне і зазвычай збіраюць вялікую аўдыторыю. Ці не ўсе рэспандэнты перакананы, што пры правядзенні масавых навагодніх мерапрыемстваў варта больш увагі надаваць арганізацыі адметных канцэртных выступленняў, якія б папулярызавалі не толькі народную творчасць, што само па сабе вельмі добра, але і класічныя музычныя традыцыі, а таксама сучаснае, часам нават і “нефарматнае” мастацтва.

— Хочацца ўбачыць крэатыўныя праекты з удзелам яркіх маладых артыстаў, спевакоў. Пагадзіцеся, самадзейнымі калектывамі сёння шмат людзей з дому не выцягнеш, — пераканана студэнтка БНТУ Алена. — Трэба, каб абавязкова было відовішча, магчыма, з удзелам нашых цудоўных піратэхнікаў.

У сувязі з апошняй прапановай нямала апытаных намі мінчан з клопатам выказваліся наконт аўдыторыі масавых святочных мерапрыемстваў, значную частку якой складаюць не прыхільнікі добрай музыкі альбо цікавых праектаў, а аматары, як гэта не сумна гучыць, моцных напояў, а таксама саматужныя “піратэхнікі”. А таму пытанні бяспекі пад час урачыстасцей гучаць вельмі актуальна.

— Спадзяюся, сёлета сітуацыя з выкарыстаннем петард і самаробных феерверкаў будзе больш жорстка кантраляваць, бо не перадаць, як непрыемна сябе пачуваеш, калі пад ногі ляцяць розныя небяспечныя рэчы, — адзначыла Вераніка, студэнтка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. — Разам з тым хочацца, каб ля навагодніх ёлак было больш дзяцей і моладзі, а не парушальнікаў грамадскага парадку.

Падобную праблему ўзняла і маладая маці Марына, нядаўняя выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, якая вельмі шкадуе, што ў Мінску на маленькіх дзяцей кожны год разлічана зусім няшмат адпаведных іх узросту мерапрыемстваў.

— Прыкладам, у мінулым годзе сутыкнулася з такой сітуацыяй, калі за фотаздымак з Дзедам Марозам, што працаваў ля навагодняй ёлкі ў нашым мікрараёне, патрабавалася выкласці немаленькую суму. У той жа час, хацелася б, каб у такіх месцах праводзіліся карагоды, якія так любіць малеча. На жаль, не выпадае казаць пра дзіцячыя кавярні, якіх так не стае сёння Мінску.

Шэраг заўваг мінчан была скіравана і на эстэтычны складнік навагодніх святкаванняў. Будучы дызайнер Вольга мяркуе, што святочнаму Мінску не хапае такіх адметных форм працы з шырокай грамадскасцю, як касцюміраваныя тэматычныя маскарады, якія, на думку студэнткі, можна праводзіць не толькі на вуліцы, але і ў прасторы музея.

— Галоўнае, каб выстаўка, у межах якой ладзіцца маскарад, была жыццярадаснай, настройвала на добры лад.

Сярод такіх мерапрыемстваў, якія можна арганізаваць пад час першых навагодніх дзён, прагучала і ідэя правядзення оперных канцэртаў. Не менш яркім шоу можа стаць, да прыкладу, і “зімовы парад” аэрапланаў, ідэю якога падказаў малады спецыяліст Дзмітрый.

К.А.

“Круглы стол” “К”:
каардынацыя міжабласнога ўзаемадзеяння

13 снежня ў Інстытуце культуры Беларусі прайшло пасяджэнне Рэспубліканскага савета дырэктараў абласных метадычных цэнтраў народнай творчасці. У сталіцы сабраліся, па сутнасці, галоўныя “штабісты” рэгіянальнага культурнага ўзаемадзеяння. Кіраўнікі абласных метадструктур на ўзроўні калегіяльнай выпрацоўкі агульнай стратэгіі сустракаліся ледзь не ўпершыню. Напярэдадні рэктар Інбелкульта Іван Крук зацвердзіў Палажэнне названага пастаяннa дзеючага грамадскага дарадчага органа, мэта якога — каардынацыя работы АМЦНТ па вырашэнні актуальных пытанняў развіцця галіны, а таксама падтрымка і ўдасканаленне навукова-метадычнага суправаджэння сацыякультурных захадаў і народнай творчасці. Савет, як вядома, узначаліў дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы Алег Хмялькоў. Апрача дырэктараў АМЦНТ у склад “творча-метадычнай” суполкі ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры краіны, Інстытута культуры Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў...

Першае абмеркаванне метадычных (і не толькі) праблем адбылося ў фармаце “круглага стала”, ініцыяванага газетай “Культура”. У дыскусіі бралі ўдзел дырэктар Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці Раіса ВАЙЦЯХОЎСКАЯ, дырэктар Гродзенскага абласнога цэнтра народнай творчасці Ірына ДЗЕМЯНЧУК, дэкан факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці БДУКіМ Мікалай КАРАЛЁЎ, дырэктар Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра Святлана КАРЖУК, рэктар Інстытута культуры Беларусі Іван КРУК, дырэктар Віцебскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці Кацярына ЛАБУКА, трэнер-кансультант Цэнтра бізнес-тэхналогій Святлана ПАПСУЙ, начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інбелкульта Ала СТАШКЕВІЧ, дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы Алег ХМЯЛЬКОЎ, галоўны спецыяліст упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Беларусі Вольга ЧАРНЯЦОВА, дырэктар Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці Мікалай ШАМШЭНЯ, а таксама рэдактар аддзела “К” Яўген РАГІН і спецыяльны карэспандэнт газеты Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.

Як не “знесці” качынае яйка?

Іван Крук.

Вольга Чарняцова.

Кацярына Лабука.

Мікалай Шамшэня.

Іван КРУК:

— Пры нашай установе ствараецца аналітычны сектар. Адно з агульных пытанняў — распрацоўка электроннай карты ўсіх фестываляў Беларусі. Гэта будзе своеасаблівая мультымедыяэнцыклапедыя з фота- і відэаінфармацыяй, якая, у перспектыве, трапіць на сайты аддзелаў культуры.

Ірына ДЗЕМЯНЧУК:

— Неаспрэчна, што тут варта распрацаваць нейкі агульны для ўсіх рэгіёнаў фармат. І ці мэтазгодна абмяжоўвацца толькі фестывалямі? У нас, да прыкладу, вельмі шмат святочных імпрэз, якія праводзяцца не горш за фестывалі і маглі б стаць брэндамі не толькі раёнаў, але і ўсёй вобласці?

Іван КРУК:

— Заўвага слушная, мы яе абавязкова возьмем пад увагу... Наступны перспектыўны крок — стварэнне электроннай карты беларускіх аб’ектаў сакральнай геаграфіі. Кола ахопу тут вельмі шырокае, але пакуль пачнём са святых крыніц, дрэў, камянёў...

Святлана ПАПСУЙ:

— Як будзе пазіцыянавацца названы партал? Для якой мэтавай аўдыторыі ён прызначаны?

Іван КРУК:

— Галоўнае, лічу, распачаць справу... Ведаю, у асобных установах ні відэакамеры няма, ні спецыяліста, які мог бы з ёю працаваць. У больш выгадным становішчы аказаўся Магілёўскі метадцэнтр, які дзейнічае ў зайздросным паразуменні з абласным тэлебачаннем... Што рабіць іншым рэгіёнам? Я ўяўляю сітуацыю так: няхай лепш застанецца “шэры” непрафесійны здымак, а не шэрая памяць.

Святлана ПАПСУЙ:

— Справа не ў тым. Непрафесійны аўтар, што выкладвае свой відэазапіс на відэа-сервісе ў Інтэрнэце, нярэдка прачынаецца знакамітым. Справа ў пазіцыянаванні партала, саміх фестываляў і святаў. Трэба ведаць, для каго і для чаго ўсё гэта. У нас процьма інфармацыйных сайтаў па гісторыі, абрадах Беларусі. Я пра рацыянальны падыход зараз кажу...

Іван КРУК:

— Мэтавая аўдыторыя — і айчынны спажывец нашай культуры, і замежны. А задача наступная — пазіцыянаванне Беларусі праз прызму культуры, стварэнне нашага іміджу за мяжой. Да таго ж, Інстытуту неабходна бачыць зрэз усяго таго, што адбываецца ў краіне па названым кірунку. Неаспрэчна, пры стварэнні электроннага рэсурсу прыцягнем і іншых маркетолагаў.

Яўген РАГІН:

— У рэдакцыю “К” пастаянна тэлефануюць чытачы, у тым ліку і замежныя, каб высветліць больш падрабязны адрас аргкамітэта фестывалю, гістарычнага ці прыроднага аб’екта, цікавага народнага майстра. Турызм, і ўнутраны і знешні, развіваецца вельмі дынамічна, таму неадкладная патрэба ў мультымедыйнай энцыклапедыі — неаспрэчная. А ў перспектыве яна можа ўтрымліваць звесткі і пра нашы сядзібы-замкі, нацыянальныя стравы... Карацей, метадычным цэнтрам ёсць над чым працаваць.

Ала СТАШКЕВІЧ:

— У сувязі з гэтым павялічваецца адказнасць метадычных цэнтраў па выяўленні, ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Сама ж база даных будзе ўтрымлівацца ў нашым Інстытуце. Гэта яшчэ адзін электронны партал на беларускай і англійскай мовах.

Іван КРУК:

— Давайце абмяркуем яшчэ адзін перспектыўны кірунак агульнай дзейнасці. Збіраемся з дапамогай метадыстаў аднавіць колішнюю практыку выдання інстытуцкага альманаха, які будзе называцца ўмоўна “Культура Беларусі” (назва пакуль рабочая). А з другой паловы 2012-га плануем распачаць работу міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Культура Беларусі: рэаліі і сучаснасць”. Нарэшце, апошняя прапанова: 1 чэрвеня — Дзень абароны дзяцей, па ўсёй Беларусі метадычныя цэнтры ладзяць творчую акцыю “Дзеці — дзецям”, калі вучні ДШМ дораць свае творы выхаванцам дзіцячых дамоў. Гэта можа быць і мастацкая выстаўка з запрашэннем музычных калектываў... Як ставіцеся да такой прапановы?

Святлана ПАПСУЙ:

— Цудоўны піяр. Але самы актыўны ўдзел у акцыі, як думаецца, павінны прыняць і самі выхаванцы дзіцячых дамоў: сярод іх таксама шмат талентаў. Мае спрацаваць прынцып уцягнення. Да прыкладу, акцыю можна распачаць яшчэ ў маі, правесці ў дзіцячых дамах майстаркласы і да Дня абароны дзяцей зладзіць сумесную выстаўку работ. Пры гэтым мерапрыемства набудзе больш важкае сацыяльнае гучанне. Больш за тое, пазней справу варта спрабаваць паставіць на камерцыйныя рэйкі. Найлепшыя работы можна выдаць у выглядзе календара. І падобныя праекты маюць перспектыву стаць вашым фірмовым стылем.

Мікалай ШАМШЭНЯ:

— Пагаджаюся з такой пастаноўкай пытання. Дзеці да падарункаў прызвычаіліся. Трэба, сапраўды, уцягваць іх у агульную творчую і цікавую справу. На Гомельшчыне даўно ладзім аналагічныя майстаркласы.

Алег ХМЯЛЬКОЎ:

— Я за такую справу і за такі піяр! Мы не заўжды паспяваем прарэкламаваць, правільна і “смачна” падаць сваю дзейнасць.

Раіса ВАЙЦЯХОЎСКАЯ:

— Тым больш, што акцыя, сапраўды, высакародная — падтрымка дзяцей.

Яўген РАГІН:

— Мы цяпер пра піяр кажам. Задача, неаспрэчна, неабходная. Тым не менш, на старонках “К” вельмі мала слушнай інфармацыі ад метадычных цэнтраў. У межах раёнаў рэклама культурных акцый наладжана няблага, а маштабы міжабласных кантактаў, на мой погляд, не вытрымліваюць аніякай крытыкі.

Раіса ВАЙЦЯХОЎСКАЯ:

— Інфармацыі шмат дасылаем, але не ўся яна друкуецца.

Яўген РАГІН:

— А ў “К” патрабаванні да такіх публікацый вельмі жорсткія: чытач з іншых абласцей павінен штосьці карыснае для сябе ўзяць. Таму і адбіраем сапраўдны крэатыў. Журналісты “К”, зразумела, фізічна не могуць наведаць усе фэсты, канцэрты, падзеі. Значыць, вы павінны спрычыняцца. І я пагаджаюся з Алегам Фёдаравічам: піярыць сябе трэба ўмець. Іван Іванавіч, а над чым найперш трэба працаваць метадцэнтрам з пункту погляду рэктара Інстытута культуры?

Іван КРУК:

— Самае галоўнае — абмен вопытам, выпрацоўка генеральных кірункаў нашага руху.

Яўген РАГІН:

— Я да чаго... Мы пад час журналісцкіх камандзіровак нярэдка сустракаемся вось з якой сітуацыяй: у адной вобласці кепска ведаюць, што адбываецца ў другой...

Іван КРУК:

— Сёння мы ў Мінску сустракаемся, наступным разам можам правесці пасяджэнне ў Брэсце, Гродне і гэтак далей. Гэта адзін з момантаў паяднання. А тое, што варта часцей бачыцца, — неаспрэчна. І не проста бачыцца, але і мець плён ад сустрэч.

Ала СТАШКЕВІЧ:

— Мы захавалі метадычную вертыкаль: абласныя і раённыя цэнтры. Ёсць Інстытут культуры Беларусі. Ва Украіне, у Арменіі, Азербайджане, Грузіі гэтага ўжо даўно няма. У Беларусі ж засталася аснова для падтрымкі рэгіянальнай культуры. Дорадзіць, правесці вучобу, падказаць, дзе знайсці грошы, — гэта наша работа. Але ў нас няма ні рэсурсаў, ні магчымасцей, каб ездзіць па ўсіх раёнах. Таму, напэўна, трэба ствараць пры РДК метадычны кабінет, дзе ёсць два-тры супрацоўнікі, і зусім іншая — калі ў раёне функцыянуе метадычны цэнтр, які з’яўляецца асобнай структурнай адзінкай аддзела культуры. Пры першым варыянце сельскія ўстановы культуры застаюцца фактычна без метадычнай падтрымкі, бо супрацоўнікі таго ж кабінета больш працуюць на горад. У чатырох раёнах Віцебшчыны, сапраўды, няма метадычных цэнтраў, але ў Верхнядзвінскім і Расонскім да канца года, паводле рашэння мясцовых органаў улады, гэтыя ўстановы будуць створаны. Дадам, што раёны пачалі самі разумець важнасць метадычных цэнтраў, асабліва цяпер, калі мы маем шыкоўныя аграгарадоцкія СДК, у якіх можна на высокім узроўні ладзіць разнастайныя масавыя мерапрыемствы пры выдатнай матэрыяльна-тэхнічнай базе. Ды і метадысты сёння маюць вялікую нагрузку: акрамя метадычных парад, займаюцца, напрыклад, падрыхтоўкай дакументаў па нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыне. Акрамя іх гэтую работу не зробіць больш ніхто. Таму, думаю, паступова РМЦ з’явяцца ва ўсіх раёнах Віцебшчыны.

або Рэцэпт метадалогіі з дынамікай і эканомікай

Яўген РАГІН:

— Вось і я быў у Бешанковіцкім раёне некалькі гадоў таму, і на сяле мне супрацоўнікі СДК скардзіліся: ідэй у нас шмат, але параіцца няма з кім. Так, праблема паступова вырашаецца. Але супрацоўнікі і ў Бешанковічах, і ў іншых раёнах Беларусі казалі пра тое, што ім у працы хранічна не стае метадычнай літаратуры. Што з вырашэннем гэтага пытання?

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Свайго метадычнага цэнтра, наколькі я ведаю, не мае і Бярэзінскі раён Мінскай вобласці. А там ён таксама вельмі патрэбны.

Святлана Папсуй.

Раіса Вайцяхоўская.

Мікалай Каралёў.

Раіса ВАЙЦЯХОЎСКАЯ:

— Гэта адзіны раён Міншчыны, які не мае такой установы, але, паверце, мясцовыя метадысты, што працуюць пры Бярэзінскім РДК, забяспечваюць сваімі распрацоўкамі ўсе сельскія Дамы культуры.

Яўген РАГІН:

— Раённы метадычны цэнтр на сёння вельмі важны, бо ў ім аб'ядноўваюцца не толькі здабыткі мясцовых метадыстаў, але і напрацоўкі супрацоўнікаў абласных устаноў. Прынамсі, так павінна быць... Сёння ўжо казалі пра неабходнасць ініцыятыў знізу. На жаль, у нашых паездках па рэгіёнах не так ужо і часта даводзіцца чуць пра цікавыя праекты, народжаныя ў глыбінцы. Напрыклад, на Брэстчыне зрабілі праект "Журавінавы фэст"...

Святлана КАРЖУК:

— Так, і свята журавін прайшло на Століншчыне з вялікім поспехам.

Яўген РАГІН:

— "К" пра гэта пісала. Але, на жаль, іншых прыкладаў паспяховых раённых праектаў не так ужо і шмат. Чаму? Куды знікаюць тыя маркетолагі, якіх рыхтуюць у БДУКіМ?

Мікалай КАРАЛЁЎ:

— Маркетолагаў у чыстым выглядзе наш універсітэт не рыхтуе. У нас ёсць менеджары сацыяльнай і культурнай сферы, ёсць менеджары міжнародных культурных сувязей.

Яўген РАГІН:

— Але ўсё-такі праектаў з раённых аддзелаў культуры, з сельскіх устаноў культуры магло б быць і больш.

Іван КРУК:

— Цалкам слушная заўвага. Але хачу распавесці вось пра што. На маю падобную рэпліку на адным з абласных семінараў яго ўдзельніца з Докшыцкага раёна заявіла: "А адкуль я ведаю, што мой праект цікавы іншым? Адкуль я ведаю, што ён можа быць прадстаўлены і ў Мінску, і ў Парыжы?" Таму трэба мець магчымасць погляду збоку.

Мікалай КАРАЛЁЎ:

— Каб зрабіць цікавы праект, варта рабіць ухіл на падрыхтоўку адпаведных высокакваліфікаваных кадраў. А з гэтым у нас ёсць пытанні. Я лічу, каб вырашыць кадравую праблему, няблага выйсці на трохгадовую адпрацоўку па размеркаванні, а таксама больш увагі звярнуць на завочнікаў. Бо чалавека, які адвучыўся на нашым факультэце на дзённым аддзяленні, потым у раён не зацягнеш. А вось той выпускнік, які нарадзіўся ў пэўным рэгіёне, мае там жыллё, сям'ю, — іншая справа: ён абавязкова вернецца назад. З ім можна заключаць кантракт на тры, пяць гадоў. Дарэчы, налета на нашым і некаторых факультэтах БДУКіМ будзе падвоены выпуск, так што можна разлічваць: у рэгіёны спецыялістаў прыедзе нашмат болей, чым у мінулыя гады.

І яшчэ. Я лічу, што з цягам часу варта было б нашаму Універсітэту культуры і мастацтваў па найбольш прэстыжных спецыялізацыях — рэжысура, харэаграфія, менеджмент ды іншыя — ствараць філіялы ў рэгіёнах. Напрыклад, у Пінску, Баранавічах, Маладзечне, Наваполацку. У гэтых гарадах ёсць свае вышэйшыя навучальныя ўстановы, установы сферы культуры, таму шмат якіх спецыялістаў прывозіць туды з Мінска стане непатрэбна. Гэта, на маю думку, вырашыць кадравае пытанне сферы культуры.

Алег ХМЯЛЬКОЎ:

— Хачу расказаць пра іншае: пра вопыт нашых калег. На свае вочы ўбачыў дзейнасць мадэльных устаноў культуры, наведаўшы Белгародскую вобласць Расіі і Татарстан. Мадэльная ўстанова культуры па-расійску, гэта, фактычна, наш аграгарадок. Адзначу тое, што ў Белгародскай вобласці ў развіцці ўстаноў культуры зацікаўлены сам кіраўнік рэгіёна — прынята адпаведная губернатарская праграма. Таму ўся сацыяльная сфера сапраўды ўзорная. У кожным раёне вобласці — адна-дзве мадэльныя ўстановы культуры. Яны аснашчаны самай сучаснай гукаўзмацняльнай і светлавой апаратурай, але самае галоўнае — у штаце падобнай установы адзінаццаць супрацоўнікаў! Да таго ж, кожная мадэльная ўстанова культуры мае свой духавы аркестр са штатам пятнаццаць чалавек. Суміруем і атрымліваем штат сельскага Дома культуры. Тое самае акрамя вялікіх штатаў створана ў Татарстане, дзякуючы былому прэзідэнту Мінційміру Шайміеву. Усе музеі там інтэрактыўныя, там нават танкі стаяць унутры будынка. Карацей, нам ёсць чаму павучыцца ў нашых расійскіх калег. Але ж і там кадравая праблема існуе таксама, як і ў нашых установах культуры.

Ірына Дземянчук.

Алег Хмялькоў.

Святлана Каржук.

Вольга ЧАРНЯЦОВА:

— Ёсць праблемы і ў нашай сістэме ўстаноў культуры. Напрыклад, адна з найбольш актуальных — нарматыўная. Мы плануем кардынальна памяняць тую сістэму ўстаноў культуры, якая склалася на сённяшні дзень. Трэба ўводзіць для іх статус юрыдычнай асобы. Напрыклад, стварыць цэнтралізаваную клубную сістэму па прыкладзе той, якая існуе ў бібліятэчнай сферы. І надаць ЦРБ, РДК ці РМЦ статус юрыдычнай асобы. Таксама абавязкова варта правесці адпаведную працу з гаспадарчымі групамі і бухгалтэрыямі, якія працуюць пры раённых аддзелах культуры. З падобнымі ідэямі мы плануем выйсці на Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і цягам наступнага года вырашыць пытанне. Да 1 лютага 2012-га збяром рабочую групу — куды, натуральна, увойдуць і кіраўнікі абласных метадычных цэнтраў. Яна выпрацуе рэкамендацыі па гэтым накірунку дзейнасці.

Алег ХМЯЛЬКОЎ:

— За прыклад прапаную ўзяць тую цэнтралізаваную клубную сістэму, якая ўжо існуе каля дваццаці гадоў ў Магілёўскай вобласці. Хоць наша ЦКС, як і ЦБС, пакуль не мае статусу юрыдычнай асобы, але гэтае пытанне лёгка вырашыць.

Вольга ЧАРНЯЦОВА:

— Зазначу, што ніхто не збіраецца насаджаць адзіную мадэль ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Кожная вобласць вызначыць свой накірунак. Па ім і будзе прадастаўляцца статус юрыдычнай асобы ўстановам культуры.

Ірына ДЗЕМЯНЧУК:

— Лепей, на маю думку, пайсці праверaным шляхам і ўзяць за прыклад Магілёўшчыну.

Мікалай КАРАЛЁЎ:

— Можна надаць статус юрыдычнай асобы галаўной арганізацыі, а ўсе іншыя клубы ці бібліятэкі стануць філіяламі гэтай установы.

Яўген РАГІН:

— Не магу не вярнуцца да таго важнага пытання, якое ўжо закранаў. Якія перспектывы па выданні метадычнай літаратуры для рэгіёнаў? Добрыя прыклады ў гэтым кірунку ёсць. Ведаю, Алег Фёдаравіч, што ўпраўленне культуры аказала фінансавую падтрымку выданню кнігі "Беларускі народны танец: традыцыі і сучаснасць (Магілёўшчына)".

Алег ХМЯЛЬКОЎ:

— Так, дзякуючы Інстытуту культуры Беларусі і яго супрацоўніку, Міколу Козенку, гэтае выданне пабачыла свет. У сваю чаргу мы вырашалі шмат арганізацыйных, тэхнічных нюансаў, збіралі матэрыялы. Сігнальны асобнік кнігі, сапраўды, ужо выдадзены, адлюстроўвае ўсе танцы Магілёўшчыны, мае вялікі аб'ём — прыкладна 600 старонак — у колеры, на цудоўнай паперы. Таму мы заклалі на будучы год сродкі, каб набыць гэту кнігу праз бібліятэчную і клубную сістэмы вобласці.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— А што з выданнем метадычнай літаратуры Інстытутам культуры Беларусі?

Іван КРУК:

— Пэўныя сродкі на гэту дзейнасць мы запланавалі, таму ў наступным годзе метадычная літаратура будзе выдавацца абавязкова.

Алег ХМЯЛЬКОЎ:

— Яшчэ хацелася б закрануць пытанне дыскатэк. Ці плануецца ўнесці змены ў заканадаўства і вярнуцца да практыкі, калі непаўналетнія маглі прысутнічаць на танцавальных мерапрыемствах не да 10 гадзін вечара, а на больш позні тэрмін?

Вольга ЧАРНЯЦОВА:

— На сёння пакуль не прыняты закон аб знаходжанні непаўналетніх у начны час на дыскатэчных мерапрыемствах. Калі гэты дакумент быў дасланы на разгляд у Міністэрства культуры, дык мы ўнеслі ў яго свае прапановы. Сутнасць іх у наступным: падлеткі да 14 гадоў могуць знаходзіцца на дыскатэках да 10 гадзін вечара, ад 14 да 16 гадоў — да 12 гадзін, а старэйшыя — на неабмежаваны прамежак часу. Таму, як толькі будзе прыняты гэты нарматыўны дакумент, мы адразу ініцыюем пытанне аб зменах артыкула 17.12 Кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях.

Але і цяпер мясцовыя выканаўчыя ўлады сваім рашэннем могуць дазваляць правядзенне дыскатэк для непаўналетніх на неабмежаваны перыяд у адпаведнасці з пунктам 18 Палажэння аб дыскатэчных мерапрыемствах.

■■■

Пад час першага пасяджэння Рэспубліканскага савета дырэктараў АМЦНТ акрэслена праблемнае поле пытанняў, над вырашэннем якіх мяркуецца працаваць у 2012 годзе. Сярод прыярытэтных напрамкаў дзейнасці: міжнародныя і міжнацыянальныя стасункі, распрацоўка і рэалізацыя інавацыйных бізнес-праектаў у галіне культуры і метадычнай практыкі, інфармацыйна-рэкламныя тэхналогіі, новыя тэхналогіі наладжвання вучобы кадраў, замацаванне маладых спецыялістаў на сяле... Словам, рэспубліканскі метадычны штаб распачынае сваю дзейнасць. Спадзяемся, плён яе акажацца сапраўды важкім і агульнакарысным.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Вядучы рубрыкі —
Кастусь АНТАНОВІЧ

Ад яхт-клуба да сінема

Дзе прайшоў першы кінасеанс на Беларусі?

Як вядома, першы кінасеанс братоў Люм'ер адбыўся 25 снежня 1895 года ў парыжскім "Гранд-кафэ" на бульвары Капуцынаў. А ўжо праз два гады, 24 студзеня 1898-га, першае кіно паказвалі ў беларускім Віцебску.

Самы першы кінатэатр Віцебска "Рэкорд" месціўся ў будынку цяперашняга Дома кіно.

На рубяжы XIX — XX стагоддзяў горад над Дзвіной быў піянерам не толькі ў выяўленчым мастацтве ды тэхніцы. Апрача знакамітай "школы Пэна" і віцебскага трамвая, першага на тэрыторыі сучаснай Беларусі, цэнтр губерні пабачыў цудоўнае вынаходніцтва, якое тады называлі "сінематографам Люм'ераў". Інфармацыя пра гэтую падзею знаходзіцца ў дакументах Нацыянальнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь. Як сведчаць запісы, першы беларускі кінасеанс адбыўся на тэрыторыі яхт-клуба, які месціўся ля вытоку ракі Віцьба побач з будынкам езуіцкага калегіума і губернскім Батанічным садам.

Сінематограф, які ў 1895 г. прадставілі браты Люм'ер.

Віцебск. 1898 г.

У "неафіцыйнай" частцы "Віцебскіх губернскіх ведамасцей" за 1898 год маюцца наступныя радкі: "Сеанс сінематографа. У суботу 24 студзеня ў зале рачнога яхт-клуба адбыўся сеанс сінематографа сістэмы Люм'ера. Паказана было 36 карцін рухомай фатаграфіі, якімі публіка вельмі зацікавілася і патрабавала паўтору многіх карцін. У нядзелю 25 студзеня дадзены быў там жа дзённы сеанс сінематографа для навучэнцаў і дзяцей у колькасці 24 карцін, які быў удастоены наведвання яе правасхадзіцельства М.В. Левашовай".

Паводле таго ж выдання, 25 студзеня апарат сінематографа "дэманстраваў" у зале Духоўнай семінарыі, 27 студзеня — у Ваенным Сабранні, 28 студзеня — у мужчынскай гімназіі, 30 студзеня — у жаночай гімназіі, а 1 лютага — для выхаванцаў мужчынскага і жаночага духоўных вучылішчаў.

Стужкі, што дэманстраваліся тады ў Віцебску, былі зняты ў Францыі і доўжыліся каля 1 — 2 хвілін кожная, што складала даўжыню каля 15 метраў. Большасць з іх былі хранікальна-дакументальнымі (з натуры), і стужкі, як правіла, усе здымаліся адным аператарам. Якасць і сюжэт фільма былі другаснымі: галоўным у тэхнічнай навінцы тады з'яўлялася магчымасць бачыць людзей і прадметы, што рухаюцца на экране.

Назвы тагачасных "блакбастараў" гавораць самі за сабе: "Французская артылерыя на парадзе", "Негры купаюцца", "Жаночая сварка", "Манументаліст", "Азартныя гульцы", "Купальня", "Дыяна ў Мейландзе", "Скачкі з перашкодамі", "Іспанскі нацыянальны танец". Мяркуецца, што стужкі паказваліся французскім аператарам Феліксам Мейнардам.

Чаму месцам першага кінасеанса ў Віцебску быў абраны менавіта яхт-клуб? На той час ён быў месцам, дзе адбываліся сямейныя, літаратурныя, музычныя, танцавальныя, драматычныя вечарыны і спектаклі. На жаль, да нашага часу яго будынак не захаваўся, аднак месца колішняга знаходжання адзначана на карце, надрукаванай на падставе арыгінала абласной Дзяржаўнай архіўнай службы.

Першы кінасеанс заразіў віцябчан вялікай цікавасцю да новага мастацтва. Ужо ў 1911 годзе ў Віцебску працавалі чатыры кінематографы або "некельадэоны", як тады называлі кінатэатры: "Вулкан", "Ілюзіён", "Гігант", "Біяскоп". У 1917 у горадзе працавалі "Рэкорд" (зараз "Дом кіно"), што знаходзіцца ў будынку — помніку архітэктуры канца XIX стагоддзя, "Кіна-Арс", "Ілюзіён", "Мастацкі".

Дзяржаўнай праграмай "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады ў наступным годзе на месцы першага беларускага кінапаказу прадугледжана ўстаноўка памятнага знака.

Алена МАТУС,
галоўны спецыяліст
Дэпартамента па кінематаграфіі
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

Налібоцкае люстэрка з Урэцкай мануфактуры

Дык дзе ж знаходзілася "беларускае Мурана"?

Люстэрка з гарадзішча Ліскі Рэчыцкага раёна.

Пакрасавацца перад люстэркам, думаецца, любілі і нашы продкі тысячы гадоў таму. Але ўбачыць сваё адлюстраванне першабытны чалавек мог хіба што ў азёрнай роўнядзі — першым прыродным люстэрку. Верагодна, з'яве адлюстравання прадметаў прыпісвалі нашы прашчуры і розныя магічныя ўласцівасці. Невыпадкова ў наш час дзяўчаты ў ноч перад Калядамі варожаць, карыстаючыся вадой і люстэркам...

Налібоцкае люстэрка з Урэчча.

Паліруючы прылады, выкананыя з цвёрдых крышталічных парод, чалавек звярнуў увагу, што здольнасць адлюстравання прадметаў уласцівая не толькі вадзе. Першыя ж выраблены люстэркі былі знойдзены пад час археалагічных раскопак селішча Чаталгуюк у Турцыі. Менавіта там навукоўцы выявілі вырабы з вулканічнай масы — абсідыяну, — што датуюцца 8 — 7 тысячагоддзямі да нашай эры. Да таго ж, з абсідыяну ды пірыту выраблялі рытуальныя люстэркі плямёны індзейцаў Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі. Пазней, у эпоху ранніх металаў, люстэркі пачалі рабіць з бронзы ці медзі.

Прыемна, што гэта вынаходства старажытнай цывілізацыі не абмінула і беларускія землі. У прыватнасці, на гарадзішчы ранняга жалезнага веку, размешчаным каля вёскі Ліскі Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці, былі знойдзены два люстэркі дыскападобнай формы, адлітыя з бронзы. На адваротным баку гэтых дыскаў, па цэнтры, зроблены ручкі ў выглядзе пяцелек. Датуюцца ж гэтыя люстэркі VII — VI стст. да н.э. Варта адзначыць, што гэта самыя старажытныя люстэркі, знойдзеныя на Беларусі.

Як сведчаць артэфакты, дыскападобная форма бронзавых люстэркаў першапачаткова перакачавала ў Візантыю, а адтуль прыйшла і на тэрыторыю Кіеўскай Русі. Да прыкладу, люстэрка некалькі разоў згадваецца ў літаратурным помніку XII стагоддзя "Слова Данііла Заточніка", звернутым да князя Яраслава Уладзіміравіча.

Але якімі б ні былі прывабнымі люстэркі з бронзы, яны усё ж мелі адзін істотны недахоп. Пад уплывам паветра паверхня бронзавых люстэркаў цямнела, затым яны станавіліся мутнымі і гублялі свой бляск. З гэтай уласцівасцю металу спрабавалі неяк змагацца. Напрыклад, бронзавыя люстэркі змяшчалі ў футарал, куды ўкладвалася і невялікая губка са здробненай у парашок пемзай.

Шырокія колы насельніцтва беларускіх зямель, як і ўсёй Русі, ужывала люстэркі куды больш простай формы. Гэта былі дыскападобныя накрывачкі дыяметрам 4 — 5 см. Унутраная прастора адной з іх апрацоўвалася свінцовай фольгай, паверх яе ўкладвалася гладка адпаліраванае празрыстае шкло. Падобныя складныя люстэркі змяшчалі ў скураныя футаралы і падвешвалі да пояса, што давала магчымасць пры неабходнасці дастаць яго і паглядзецца. Люстэркі менавіта такога тыпу былі знойдзены пад час раскопак у Віцебску, а таксама ў Вялікім Ноўгарадзе і Пскове.

Будучыня ўсё ж была за шкляными люстэркамі. Спачатку гэта былі проста кавалкі чорнага або цёмнага шкла. Пра гэта, галоўным чынам, сведчаць знаходкі археолагаў пад час раскопак у Егіпце і Пампеях. Аднак прыкладна ў III стагоддзі да шкляных лістоў пачалі прыкладваць тонкую пласціну золата, срэбра альбо медзі. Тым не менш, з-за таго, што шкло было непаліраваным, такія люстэркі давалі недакладную выяву.

У XV стагоддзі свінец замянілі алавяннай фольгай, на якую налівалі ртуць. Апошняя растварала волава і добра прыліпала да шкла. Але люстэркі атрымліваліся цёмнымі, бо, як вядома з фізікі, ртуць паглынае вельмі шмат святла. Не дзіўна, што ртуць вырашылі замяніць срэбрам. У выніку люстэркі сталі больш светлымі, праўда, разам з тым, істотна падаражэлі.

Нарэшце, у 1516 годзе браты Андрэа і Даменіка з Мурана (востраў у Венецыянскай лагуне) прапанавалі вырабляць люстэркі з суцэльнага крыштальнага шкла. Дзякуючы гэтаму ноу-хау Венецыя стала манапалістам па вытворчасці люстэркаў. Сакрэт стварэння іх настолькі дбайна аберагаўся венецыянцамі, што майстар, які адважваўся раскрыць гэтую таямніцу чужаземцам, мог быць асуджаны на смерць.

У XVIII стагоддзі з'яўляецца багемскае шліфаванае шкло, якое выраблялася ў Чэхіі. Пры гэтым была наладжана і вытворчасць люстэркаў. Адтуль гэтая тэхналогія перайшла ў Польшчу, а затым і ў Вялікае Княства Літоўскае. Варта адзначыць, што першую мануфактуру на тэрыторыі Беларусі, дзе арганізавалі вытворчасць люстэркаў, заснаваў у 1717 годзе князь Радзівіл у мястэчку Налібокі, што сёння знаходзіцца ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці. А праз дваццаць гадоў, у 1737-м, Ганнай Радзівіл была заснавана Урэцкая шкляная мануфактура, якая першапачаткова называлася люстраной. Цікавы факт: у 1741 — 1765 гадах кіраўнік гэтай мануфактуры Т.Шэрбер укараніў у вытворчасць выпуск люстэркаў па французскім, багемскім і англійскім узорах. Вырабы майстроў Урэцкай мануфактуры былі настолькі якасна выкананы, што і сёння не перастаюць уражваць наведвальнікаў Эрмітажа, Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве, львоўскага Музея этнаграфіі і мастацкай прамысловасці, нацыянальных музеяў Кракава і Варшавы.

Леанід КАЛЯДЗІНСКІ,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
БДПУ імя Максіма Танка

Адрыян Прахаў: з дзяцінства не бываў на Беларусі

Гісторыя прафесара ў шэрай крылатцы

Пра Адрыяна Прахава я ведаў яшчэ ў свае студэнцкія гады як пра мастацкага крытыка, гісторыка мастацтваў, археолага, рэстаўратара і даследчыка старажытных цэркваў Кіева ды Валыні, прафесара Пецярбургскага ўніверсітэта, які, дарэчы, у 70 — 80-я гады XIX ст. выкладаў на той самай універсітэцкай кафедры гісторыі мастацтва, дзе я сам вучыўся. Але да нядаўняга часу не ведаў, што Адрыян Віктаравіч — беларус, родам з Мсціслава Магілёўскай губерні, дзе бацька яго, Віктар Іванавіч Прахаў, надворны саветнік, лінгвіст і бібліяфіл, узначальваў Дваранскае вучылішча, а маці, Еўдакія Васільеўна Палубінская, паходзіла з княжацкага роду магілёўскіх шляхціцаў.

А ў верасні 2011 года намеснік дырэктара Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П.В. Масленікава Святлана Строгіна даслала мне матэрыял, дзе паведамляла, што ў Магілёве адкрыўся XVI Міжнародны пленэр па жывапісе, прысвечаны 165-годдзю з дня нараджэння А.В. Прахава. 24 верасня на будынку Магілёўскага гісторыка-археалагічнага музея была адкрыта мемарыяльная дошка "славутаму сыну зямлі Магілёўскай".

М.Крамской. Партрэт Адрыяна Прахава.

У згаданых урачыстасцях прынялі ўдзел, акрамя кіраўніцтва вобласці і Мсціслаўскага раёна, пісьменнік, дырэктар Інстытута сацыяльнай памяці Акадэміі ваенных навук Расіі, даследчык жыцця і творчасці А.В.Прахава А.Ужанаў, выкладчык Маскоўскай духоўнай Акадэміі Л.Анісаў, праўнучка А.Прахава — кіяўлянка І.Прахава, прапраўнук — масквіч К.Герцаў ды яшчэ адна прапраўнучка — мастачка Н.Прахава, якая прыехала з Чэхіі удзельнічаць у пленэры. Вось так я ўпершыню даведаўся, што Адрыян Прахаў — менавіта наш зямляк. Папрасіў Святлану Строгіну зрабіць для "К" два артыкулы: грунтоўны — пра яго жыццё і творчасць (пад рубрыку "Вяртанне імёнаў), а таксама — пра вынікі таго самага пленэру, дзе ўдзельнічалі 30 мастакоў з 7 краін і які праводзіўся на тэрыторыі Дзяржаўнага музея-запаведніка В.Паленава ў Расіі і на беларускай Мсціслаўшчыне. Але, на жаль, тыя матэрыялы ад Святланы Вікенцьеўны так і не атрымаў. І таму рашыў паспрабаваць сам напісаць кароткае даследаванне пра нашага земляка, тым больш, што некаторыя з запісаў лекцый маіх студэнцкіх гадоў, якія тычыліся "кіеўскага", "абрамцаўскага", "пецярбургскага" перыядаў жыцця Прахава, а таксама яго вельмі няпростых адносін з Міхаілам Урубелем, засталіся ў маім хатнім архіве. А Святлане Строгінай, якая "адкрыла" для мяне Адрыяна Прахава як земляка-беларуса, я вельмі ўдзячны.

Вось што пісаў рускі пісьменнік Уладзімір Дзедлаў у сваёй манаграфіі "Кіеўскі Уладзімірскі сабор і яго мастацкія творцы": "У канцы мая 1880 года да дома беларускага маёнтка маёй сям'і пад'ехала паштовая брычка. У гэты час я заставаўся ў вёсцы адзін і сядзеў за абедам. Выглянуўшы на гук званочка ў акно, я пабачыў ля пад'езда чалавека сярэдняга росту і моцнага складу, у жоўтым саламяным капелюшы, у шэрай крылатцы, з акладзістай цёмна-русай барадой і ў невялічкіх залатых акулярах. З-пад капелюша прабіваліся кучары, якія пачыналі сівець. Ружаватыя поўныя вусны ўсміхаліся. Шэрыя вочы весела аглядалі дом і двор. Гэта быў прафесар тэорыі і гісторыі мастацтва Пецярбургскага ўніверсітэта, дзе я тады вучыўся, Адрыян Віктаравіч Прахаў, родам беларус, які з дзяцінства не бываў на Беларусі. Зноў бачыў яе і смяяўся, і ўсміхаўся ад задавальнення сустрэчы са старой знаёмай і сваячкай — Беларуссю…"

Так, пасля смерці бацькі сям'я Прахавых рана з'ехала з радзімы ў Пецярбург. Тут наш герой вучыўся ў 3-й гімназіі, а ў 1863-м паступіў ва ўніверсітэт на гісторыка-філалагічны факультэт. Яшчэ студэнтам ён напісаў свой першы артыкул па гісторыі мастацтва "Ахіл у Эрмітажы", які быў надрукаваны ў часопісе Міністэрства народнай асветы з малюнкамі Ілы Рэпіна. І сяброўства з гэтым творцам звязвае Адрыяна Віктаравіча на доўгія гады. У сваім дзённіку 4 верасня 1865 г. ён піша: "Учора ўвечары быў у мяне Рэпін. Як хутка прывязваюся я да чалавека: не з'яўляецца Рэпін некалькі дзён, я вось і думаю: чаму гэта яго так даўно няма. Мне здаецца, што мы блізка з ім сыдземся. Хочацца мне дапамагчы яму развівацца, прыйсці самому сабе ў яснасць. Хацелася б павесці з ім добрыя, правільныя заняткі, але, на жаль, я сам так мала ведаю, што, напэўна, прыйдзецца ісці вобмацкам… Чалавек, здаецца, прынамсі, незвычайны, мо сапраўды таленавіты: сумна будзе, калі з яго не атрымаецца нічога талковага. Трэба дапамагчы яму здабыць сабе цяпер дастатковы запас ведаў, забяспечаную адукацыю, каб потым больш свабодна было яму ў вызначэнні свайго лёсу. Задача мастака такая высокая і такая таму цяжкая, што яна, акрамя (няма чаго і казаць) неабходнага прыроднага даравання, патрабуе ад чалавека вельмі, вельмі трывалай адукацыі".

Пасля заканчэння вучобы ў 1867 годзе Прахава камандзіравалі ў Еўропу для, як сёння сказалі б, "павышэння кваліфікацыі". Спачатку ў Мюнхене ён слухаў лекцыі вядомага прафесара археалогіі, буйнога знаўцы этрускага і грэчаскага мастацтва Генрыха Бруна, вывучаў помнікі старажытнагрэчаскага мастацтва, потым наведаў Берлін, Парыж, Лондан, Вену, розныя гарады Італіі. У 1873-м вярнуўся ў Пецярбург, атрымаў там ступень магістра, стаў дацэнтам універсітэта. Свае лекцыі па тэорыі і гісторыі мастацтва ён з заўсёдным поспехам чытаў і ў сваёй "alma mater", і — паралельна — у Акадэміі мастацтваў. А ўлюбёным дэвізам Прахава было выслоўе з "Дзеянняў апосталаў": "Шчаслівы той, хто больш дае, чым атрымлівае".

Пісьменнік В.Верасаеў успамінае: "З задавальненнем слухаў я на 4-м курсе лекцыі па гісторыі грэчаскага мастацтва. Чытаў прафесар Адрыян Віктаравіч Прахаў, — чытаў заўзята і бліскуча. Сіваваты чалавек з палегаваным, панскім тварам, у залатых акулярах… Чытаў у будынку ўніверсітэта, у кабінеце мастацтва, але часта прызначаў лекцыі ў Эрмітажы альбо Акадэміі мастацтваў, і там чытаў, проста перад статуямі, пра эгінскія мармуры, пра скульптурныя тыпы Венеры, Зеўса і Апалона…"

І.Рэпін таксама высока ацэньваў лекцыі Прахава: "Адрыян Віктаравіч адной-чы ўжо апісаны ў мяне ў артыкуле "Смяротная кара Каракозава" (у маёй аўтабіяграфіі); ён быў прафесарам універсітэта (класічнай скульптуры) і чытаў публічныя лекцыі ў Акадэміі мастацтваў, у скульптурным музеі. Яны мелі велізарны поспех. На лекцыі Адрыян Віктаравіч прыносіў з сабой вялікі стос кніг. Я з вялікай цікавасцю наведваў заняткі ў кампаніі маіх вучняў Тэнішаўскай школы. Асабліва дзве лекцыі: пра Ніябею і Лаакаона — выклікалі выключны інтарэс па сваёй паўнаце і рэдкіх матэрыялах прафесара. І па многіх эпізодах класічнага свету Адрыян Прахаў захоплівaў слухачоў гістарычнай, яшчэ нікім не кранутай, праўдай. Гэта быў філосаф, які добра ведаў мову элінаў, і ён нас уражваў да неймавернасці новымі ведамі з класічнага свету. Яшчэ цэлы міф аб Праметэі. Гэтыя міфы і гістарычныя матэрыялы здзіўлялі нас сваёй навізной. Аб Праметэі незвычайна чуллівa, незабыўна... Ніякі раман не мог так захапляць. Праметэй — гэта Хрыстос элінаў".

У перапынках паміж выкладаннем Прахаў вандраваў па Егіпце, Сірыі, Судане, Палесціне, Грэцыі, Турцыі, абараніў доктарскую дысертацыю па архітэктуры старажытнага Егіпта, а потым цалкам перайшоў на вывучэнне помнікаў старажытнай Русі. У пачатку 1880-х гадоў даследаваў і зрысаваў рэшткі мазаікі і насценнага жывапісу ў Сафійскім саборы ды фрэскі Кірылаўскай царквы ў Кіеве, даследаваў сабор паўднёва-заходняй Валыні, а таксама адкрыў і скапіраваў фрэскі ў царкве кіеўскага Міхайлаўскага Златаверхага манастыра. Да сваёй дзейнасці падыходзіў строга навукова: з фрэсак і мазаік заўсёды рабіў фотатыпіі і фатаграфіі. У 1887 годзе Прахаў перайшоў з Пецярбургскага ўніверсітэта ў Кіеўскі ўніверсітэт святога Уладзіміра на кафедру прыгожых мастацтваў, дзе і прапрацаваў аж 10 гадоў — да вяртання ў Пецярбург на родную кафедру.

Але вернемся ў Кіеў. Да работы ў тамтэйшай Кірылаўскай царкве прафесар Прахаў прыцягнуў маладога Міхаіла Урубеля. Меркавалася, што Урубель прыедзе ў Кіеў на 76 дзён і за 1200 рублёў намалюе чатыры лікі святых для аднаяруснага мармуровага іканастаса царквы ў візантыйскім стылі. Яго парэкамендаваў Прахаву Павел Чысцякоў, акадэмічны настаўнік будучага аўтара "Дэмана". Сказаў Прахаву, што "ён — мой лепшы вучань, больш таленавітага я не ведаю". І вось вясной 1884 г. у кіеўскай кватэры Прахавых у доме №6/11 на рагу Уладзімірскай і Вялікай Жытомірскай вуліц з'явіўся 27-гадовы "хударлявы, русы, сарамлівы малады чалавек з тонкімі рысамі твара… няруская тыпу". Тут яго цёпла сустрэлі Адрыян Прахаў і яго жонка, 32-гадовая прыгажуня Эмілія Львоўна, маці траіх дзяцей, якая была на той час сапраўднай душой кіеўскага грамадства. Адразу па прыездзе Міхаіл узяўся за работу. Ён цудоўна "адчуваў" сцяну царквы, навучыўся працаваць шырокімі колеравымі плямамі, як і старажытныя іканапісцы. Праўда, замест таго, каб аднаўляць візантыйскія фрэскі, ён стаў пісаць новыя. Да пары да часу гэта задавальняла Прахава. Акрамя ікон для іканастаса, Урубель напісаў роспісы "Сашэсце Святога Духа", "Уезд Хрыста ў Іерусалім", "Благавешчанне". Перспектывы былі самымі радаснымі: у Кіеве заканчвалася будаўніцтва Уладзімірскага сабора, апрацоўку інтэр'ера даручылі ўсё таму ж Прахаву. Адрыян Віктаравіч з самага пачатку ўжо намякнуў Урубелю: маўляў, рыхтуй эскізы роспісаў.

Вось што пісаў у лісце да родных 15 студзеня 1891 г. Міхаіл Несцераў: "У нядзелю быў я ў Кірылаўскім манастыры (XII ст.). Яго рэстаўраваў гады тры-чатыры таму Прахаў. Там між іншымі мастакамі ёсць работы Урубеля (чатыры абразы ў іканастасе). Пісаў ён іх у Венецыі пад уражаннем старажытных майстроў і прыклаў да гэтага свой дзівосны талент, і выйшла нешта, ад чаго вочы могуць разгарэцца. Асабліва цудоўная мясцовая ікона Багародзіцы, не кажучы ўжо пра тое, што яна незвычайна арыгінальна ўзятая, сімпатычная, але галоўнае — гэта дзіўная, строгая гармонія ліній і фарбаў". Тут жа, у царкве, Урубель напісаў фрэску "Сыходжанне Святога Духа на апосталаў", у кампазіцыі якой немагчыма не пазнаць Адрыяна Прахава ў адным са Святых айцоў (трэці злева). Ён застыў у характэрнай позе, у стане нейкага захаплення. І здаецца, менавіта так і сам Прахаў у зямным жыцці пазіраў на візантыйскі і старажытнарускі манументальны жывапіс, якому ён аддаў большую частку сваёй біяграфіі.

І вось тут пачынаецца сапраўдная меладрама, якая тычыцца сяброўства-варожасці паміж Прахавым і Урубелем. Гісторыя гэтая ў свой час нарабіла шмат шуму, выклікала шмат размоў, тлумачэнняў, дзе плёткі і праўда ішлі побач. Справа ў тым, што правобразам Багародзіцы паслужыла жонка Адрыяна Прахава — Эмілія Львоўна, таленавітая піяністка, а ў вобразе Сына сучаснікі ўгледжвалі падабенства з малодшай дачкой Прахавых — Вольгай. Праўда, Урубель амаладзіў твар Багародзіцы на іконе ў параўнанні з правобразам і трошкі скарыстаў таксама рысы твару старэйшай дачкі Прахавых — Алёны. Але, як бы там ні было, Эмілію Львоўну на чуллівай і журботнай іконе пазнавалі ўсе, хто ведаў сям'ю Прахавых. Бо Урубель уклаў у гэты вобраз такое пачуццё, якое дазволіла лічыць яго найвышэйшым дасягненнем мастака ў адлюстраванні святых лікаў…

Словам, здарылася неверагоднае: абрынулася на Міхаіла горкая любоўная напасць! У свае 27 гадоў Урубель заставаўся падлеткам, ва ўсялякім разе ў тым, што тычылася жанчын. А тут побач з'явілася яна, раскошная свецкая львіца, трапная, вопытная і самаўпэўненая Эмілія Львоўна Прахава з "цёмна-валошкавымі вачыма і вельмі выразнымі вуснамі". Ён закахаўся ў яе трапятліва і безнадзейна. Яна сталася для яго Цудоўнай Дамай, музай і натхняльніцай — і прычынай таго, што талент Урубеля не будзе рэалізаваны ў той ступені, у якой гэтага хацелася б і самому мастаку. Хаця менавіта ў Кіеве, дзякуючы Адрыяну Прахаву, ён ператварыўся са студэнта ў майстра, а таксама ўпершыню сустрэў тут свайго Дэмана, які стаў для мастака галоўнай візітоўкай на ўсё жыццё. Але гэтая жанчына была Мішу "не па зубах". Як ён ні стараўся ўразіць яе ўяўленне ці то гарачым поглядам, ці то шматзначным уздыхам, ці то спяваннем пад яе акампанемент, ці то букетам кветак — нічога не атрымлівалася. Быў, аднак, момант, калі Эмілія Львоўна вось-вось павінна была растаяць і… Але Урубель нечакана сам падаўся назад: можа, ад прыроднай сарамлівасці, а можа, ад няёмкасці перад сваім дабрадзеем — Адрыянам Віктаравічам Прахавым. Але ўсё роўна кахаў, і не ўтойваў, не хаваў гэтага пачуцця. А калі Урубель даведаўся, што ў жанчыны ёсць палюбоўнік — нейкі бравы палкоўнік, які, узяўшы яе "штурмам" без усялякіх там прыгожанькіх "рэверансаў", дарыў яхантавыя завушніцы і адвозіў яе на тройцы з бразготкамі на шыкоўныя пікнікі, — зусім упаў духам ад рэўнасці. Адзінае, што заставалася няшчаснаму мастаку — гэта маляваць каханую…

Іканастас кіеўскага Уладзімірскага сабора, выкананы майстрамі пад кіраўніцтвам Адрыяна Прахава.

(Заканчэнне будзе.)

Барыс КРЭПАК

з 17 снежня

АК Афіша "К"

да 24 снежня

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.

Экспазіцыі:

- Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
- Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
- Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
- Экспазіцыя жывапісу, скульптуры, графікі мастакоў 1940-х — 1980-х гг.

Выстаўкі:

- **"Мастацтва суверэннай Беларусі. Новыя паступленні ў музейныя калекцыі. 1991 — 2011".**
- **"Зачараванне графікай"** (П.Любамудраў і Л.Марчанка).
- **"Вобраз Прасвятой Багародзіцы ў беларускім іканапісе XVII — XVIII стст.".**

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.

- Пастаянная экспазіцыя.
- **"Цярноўнік крэсаў".**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка японскага мастацтва.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст.".**
- Выстаўка рускага жанравага жывапісу XIX — пачатку XX стст.

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:

- **Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст.".**
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
- **"З крыніц адвечнай прыгажосці".**
- **"Водбліскі ваеннай славы"** (еўрапейская зброя і вайсковае абмундзіраванне XIX — 1-й пал. XX стст.).
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст.".**

Выстаўкі:

- Рэспубліканская выстаўка **"Вайна 1812 года ў гісторыі Мінска"** (масштабная экспазіцыя з шасці тэматычных раздзелаў).
- Фотавыстаўка **"Сцежкі творчасці. Фрагменты"** Я.Казюлі, прысвечаная шматгадовай творчасці фатографа.
- **"Заплакалі струны жывыя"** (выстаўка музычных інструментаў).

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка Р.Махмудава **"Лятаючыя кветкі".**
- Выстаўка С.Нурматава **"Даспехі часоў Паўночнай вайны".**
- Выстаўка фатаграфій **Сяргея Плыткевіча "Вандроўка па Беларусі".**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

- Экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
- Выстаўка **"Дарога да Пушкіна"** (з фондаў Дзяржаўнага мемарыяльнага гісторыка-літаратурнага і прыродна-ландшафтнага музея-запаведніка А.С. Пушкіна "Міхайлаўскае").
- Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 227 78 66.

- Пастаянная экспазіцыя **"Жыццё і творчасць Янкі Купалы".**
- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.
- Інтэрактыўная гульня **"У пошуках Папараць-кветкі".**

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 56 21.

Выстаўкі:

- **"З вамі вярнуўся дахаты я..."** (да 120-годдзя з дня нараджэння М.Багдановіча).
- Літаратурна-мастацкая выстаўка **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам".**

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11. Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:

- **"Індыя. Праз Гімалаі на даху аўтобуса".**
- **"Вялікія мумііЕгіпта".**
- **"Бацькі і дзеці"** (юбілейная выстаўка творчай дынастыі Сяргея Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад Свет субтрапічных раслін і жывёл.

Працуюць рэстаўрацыйныя майстэрні і аддзел па турызме (вул. Кірава, 8).

Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў

Экспазіцыя **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:

- **"Час азірнуцца".**
- **"Класікі беларускага жывапісу XX ст.".**

Паўночнае крыло палаца

Выстаўкі:

- **Пакой крывых люстэркаў.**
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.

Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі".**

ГАЛЕРЭІ*

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск,вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.

- Выстаўка **"Я не самотны..."**, прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння М.Багдановіча.
- Выстаўка **"Суб'ектыўны рэалізм"** (жывапіс, скульптура).

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.

- Арт-праект выкладчыкаў кафедры народнага ДПМ БДУКМ "III у I. Частка III" **"Выстава 13"** Д.Барсукова (жывапіс). **"Сустрэча"** К.Дзягілевай-Бяляевай (жывапіс). **"Дзень за днём"** Н.Ажыдзер і Л.Дамнянковай (мастацкі тэкстыль)
- Выстава работ студэнтаў кафедры народнага ДПМ БДУКМ

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

г. Гомель, вул. Карповіча, 4, пр. Леніна, 43. Тэл.: (8–0232) 77 75 20.

Экспазіцыя:

- **"Гаўрыла Харытонавіч Вашчанка".**
- Выстаўка-продаж твораў выяўленчага мастацтва, сувеніраў і тавараў для мастакоў.

Выстаўкі:

- **"Прастора душы".**
- Выстаўка работ народнага мастака Беларусі **Леаніда Шчамялёва.**

ПАСПЯШАЙЦЕСЯ НА ПОШТУ!

НАГАДВАЕМ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА

ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА"

НА I-е ПАЎГОДДЗЕ 2012 ГОДА!

Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 63875,
ведамасная падпіска — 638752.

ТЭАТРЫ*

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

- **18 — "Севільскі цырульнік"** Дж.Расіні (Мінскі міжнародны Калядны оперны форум).
- **19 — "Снягурка"** М.Рымскага-Корсакава. (Мінскі міжнародны Калядны оперны форум).
- **20 —** Гала-канцэрт зорак сусветнай оперы.
- **22 — "Бахчысарайскі фантан"** Б.Асаф'ева.

Канцэрт да 20-годдзя беларускай капэлы.

- **23 — "Бахчысарайскі фантан"** Б.Асаф'ева.
- **24 — "Яўген Анегін"** П.Чайкоўскага.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.

- **17 — "Планета"** (бясконцая гісторыя) Я.Грышкаўца.
- **20 — "Раман+Юлія"** (музычны спектакль) Д.Балыка.
- **21,22 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** (сучасная драма) Д.Балыка.
- **23 — "Нязваны госць"** (сямейная меладрама) С.Бартохавай.
- **24** (12 00 і 14 30) **— "Дамавічкі"** (музычная казка) Я.Конева.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

- **17 — "Чырвоны Каптурык. Пакаленне Next"** А.Рыбнікава. **"Казкі венскага лесу".**
- **18 — "Прыгоды брэменскіх музыкаў"** Г.Гладкова. **"Ноч у Венецыі"** І.Штраўса.
- **20 — "Аднойчы ў Чыкага"** Дж.Стайна, Г.Мілера і інш.
- **22 — "Шчаўкунок"** П.Чайкоўскага.
- **23 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

- **17 — 24 "Навагоднія мары Слоніка".**

Ёлачная праграма "Слонік і Дзед Мароз".

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Галоўны рэдактар — Людміла Аляксееўна КРУШЫНСКАЯ

Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Марына САМОНЧАНКА (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Настасся ПАНКРАТАВА, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.

Спецкарэспандэнты:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Пётр ОВАД, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 290-22-50 (прыёмная) (017) 286-07-97, (017) 334-57-23
Тэлефон/факс: (017) 334-57-35
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41
www.kimpress.by
E-MAIL: kultura@tut.by

Выдавец — **Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"**
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.
220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77. Тэл. (017) 290-22-50.
Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
***Матэрыял на правах рэкламы.**
© "Культура", 2011.
Індэксы 63875, 638752
Наклад 7819
Падпісана ў свет 15.12.2011 у 18.30
Замова 5901
РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. пр.Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

ISSN 1994-4780